Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 5 1933 г. СЕРАДА № 146 (4690) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Масква, Наркамфіну Саюзу тав. ГРЫНЬКО, копія „Экономической жизни“, „Известиям“

Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і ўраду саветы, фінансавыя органы, пралетарская грамадзкасьць, калгасныя масы, ударнікі фінансавага фронту БССР дабіліся выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва другога кварталу на 102,4 проц., заданьне аграмаджанага сэктару гаспадаркі—на 104,7 проц

Плян першага паўгодзьдзя па мабілізацыі сродкаў выкапан на 100,4 проц., аграмаджанага сэктару—на 103,3 проц.

Пераключаемся з усёй энэргіяй на выкананьне задач другога паўгодзьдзя, перш за ўсё трэцяга рашаючага кварталу першага году другой сацыялістычнай пяцігодкі.

Нарком фінансаў БССР ХАЦКЕВІЧ.

Жанчына ў калгасах--вялікая сіла

Сёньня адкрываецца зьезд калгасьніц-ударніц Менскага раёну.

Зьезд падагуліць вынікі веснавой сяўбы і вызначыць баявыя задачы калгасьніц у часе поліва, уборкі і пастаўкі с.-г. прадуктаў дзяржаве.

Тав. Сталін у сваёй прамове на ўсесаюзным зьезьдзе калгаснікаў-ударнікаў падкрэсьліў, што «жанчына ў калгасах—вялікая сіла. Трымаць гэту сілу пад спудам, значыць дапусьціць злачынства. Наш абавязак заключаецца ў тым, каб высоўваць уперад жанчын у калгасах, пусьціць гэту сілу ў справу».

Ва ўмовах БССР, дзе сельская гаспадарка мае жывёлагадоўчы і ільнярна-бульбяны ўхіл, удзел жанчын у калгасная вытворчасьць зварачаецца мала ўвагі. Напрыклад, Асьвейскі раён прапалоў усяго 21,4 проц. збожжавых, 24 проц. ільну і 11,1 проц. агародаў. Гэта невыпадкова. У Асьвеі ўпарта ігнаруюць арганізацыю ясляў у калгасах, каб стварыць спрыяючыя ўмовы для работы жанчын у полі. Замест 40 ясляў у Асьвейскім раёне адкрыта ўсяго 18.

Або ўзяць Вушацкі раён. Тут прапалата 5,9 проц. збожжавых, 14,9 проц. ільну і 3,4 проц. агародаў. Тут таксама злачынна недаацэньваюць значэньня жаночай працы, не стараюць умоў, якія-б забясьпечылі нармальную работу калгасьніц у полі.

Арганізацыя грамадзкага харчаваньня ў калгасах і дастаўка яды непасрэдна на поле можа вызваліць тысячы жаночых рабочых рук. Гэта справа, аднак, злачынна недаацэньваецца. Плян арганізацыі калгасных сталовак выкананы па БССР усяго на 45,3 проц. Напрыклад, у Менскім раёне замест 20 сталовак адкрыта ўсяго 5. Характэрна, што Менскі раён з полівам таксама адстае—збожжавых прапалата 16 проц. ільну—8,8 проц. і агародаў—31,3 проц.

Менскі зьезд калгасьніц-ударніц, падбіваючы зьвяшча паваротны момантам ва ўдзеле жанчын у калгасная вытворчасьці.

Ні адзін калгасьніцы, якая-б ня прымала ўдзелу ва ўдарнай рабоце на поліве, уборцы і здачы збожжа дзяржаве!

Прапалоць усе пасевы, асабліва ільну, прабаранаваць і анучыць бульбу, убраць усю сенажаць, каб ні на адзін дзень не зацягнуць уборкі збожжавых і першачарговай здачы с.-г. прадукцыі дзяржаве,— вось адказныя задачы, якія паўстаюць зараз перад кожнай калгасьніцай, перад кожнай работніцай саўгасу, перад працоўнай аднаасобніцай.

Здаць у тэрмін дзяржаве збожжа, лён, бульбу і іншыя культуры—найпершы абавязак кожнага калгасу, кожнай аднаасобнай гаспадарыі.

Рэшткі кулацтва прабуюць зараз сарваць удзел калгасьніц ва ўборцы. У некаторых раёнах агенты кулацтва пашыраюць правакацыйныя чуткі, нібыта ў матак, якія аддадуць сваіх дзяцей у ясьлі, будуць вылічваць працадні.

Барацьба за ўмацаваньне калгасаў, за іх далейшы рост, за павышэньне ўраджайнасьці — гэта зараз задача ўсіх задач. Малейшым спробам кулацтва дэзарганізаваць калгасную вытворчасьць, сарваць удзел жанчын у правядзеньні поліва і ўборкі—бязьлітасны адпор.

Берагчы калгасны лад, як вока,—найпершая задача кожнай калгасьніцы.

«Толькі ў калгасе яны (жанчыны —Рэд.) маюць магчымасьць стаць на роўную нагу з мужчынай. Без калгасаў—нароўнасьць, у калгасах—роўнасьць правоў. Няхай памятаюць аб гэтым таварышы калгасьніцы і няхай берагуць калгасны лад, як вока» (Сталін).

Пакончыць са злачыннай недаацэнкай ролі і значэньня жанчын у калгасная вытворчасьці!

Сьмялей вылучаць жанчын на самыя перадавыя і адказныя вучасткі калгаснай будоўлі!

Згуртоўваючы жаночы калгасны актыў, даючы бязьлітасны адпор рэшткам кулацтва, прыдзем з бальшавіцкімі пажаданьнямі на правядзеньні поліва, падрыхтоўцы да ўборкі і збожжадачы да ўсебеларускага зьезду калгасьніц-ударніц.

ШЧЫРАЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ КАЛГАСЬНІЦАМ - УДАРНІЦАМ МЕНСКАГА РАЁНУ!

ТЭЛЕГРАМА ЦК КП(б)Б І СНК БССР

Сакратаром РК, Старшыням РВК

Мерапрыемствы па тарфяваньні і вапнаваньні глебы, зборы попелу і вынасы гною пад палар праводзяцца выключна дрэнна і знаходзяцца пад яўнай пагрозай арыву. У вашым раёне не адказа ніякай увагі гэтым мерапрыемствам, якія маюць выключна важнае значэньне па ўзьвышэньні ўраджайнасьці.

Існуе безадказнасьць, расхлябанасьць як у райвы, так і ў МТС і саўгасах. Нават не прадстаўляюць весткі аб ходзе гэтай работы. Прапануем неадкладна ўсебакова праверыць ход вывазкі гною, торфу, вапны, збору попелу і заготоўкі торфу і вапны для 1934 г.

Прымеце канкрэтныя меры ўзьдзеяньня на райвы, МТС, саўгасы, праверце складаньне каляндарных пляноў работы, праверце прымацаваньне калгасаў, саўгасаў, насельніцтва да месц заляганьня тарфяных запасаў.

Вынясіце асоб, што тармозяць работу, рашуча зьнішчаючы ўсякі сабатаж, бязьдзейнасьць. Вінаватых у арыве прыцягнеце да партыйнай і судовай адказнасьці.

Аб прынятых мерапрыемствах у пяцідзённы тэрмін паведаміце ЦК і Наркамзем.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.
Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

Сеньненскі раён скончыў поліва ільну

СМІННО (Па тэлеграфу).

Сеньненскі ільнаводны раён першым у БССР на 4 ліпеня скончыў поліва ільну на плошчы у 8.405 гектараў.

АСАБЛІВАСЬЦІ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ НА ЦЯПЕРАШНІМ ЭТАПЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ

З прамовы тав. П. П. ПОСТЫШАВА на аб'яднаным пленуме Харкаўскага абкому і аблвыканкому ад 14 чэрвеня 1933 году

АДНА З ВАЖНЕЙШЫХ РЫСАЎ СУЧАСНАЙ АБСТАНОЎКІ заключаецца ў асаблівасьці клясавай барацьбы на даным этапе. Кулацтва, клясавы вораг рэзкромлен, але рэшткі яго канчаткова не дабіты і ня выкарчаваны.

Чым больш гэтыя рэшткі клясавага ворага бачаць безнадзейнасьць і бязвыходнасьць свайго становішча, чым больш яны пераконваюцца ў несакрушальнасьці калгаснага ладу, тым вастрэй іх нянавісьць супроць нас, тым ядавіцей іх злосьць супроць калгасаў. Чым больш мы прасьледуем гэтыя рэшткі клясавага ворага па пятах, выганяючы іх з апошніх нор і прытулкаў, тым больш утончанымі і выкрутлівымі становяцца прыёмы іх барацьбы супроць калгаснага ладу і савецкай улады, тым больш старанна замятаюць яны свае сьляды, тым глыбей хаваюць яны канцы сваёй шкодніцкай работы.

Ім не зьвярнуць вёскі з калгаснага сацыялістычнага шляху, але ў зьвярыный сваёй взлобленасьці рэшткі разгромленай клясы яшчэ прабуюць укусіць, напакасьціць, нашкодзіць.

ГЭТЫМ НОВЫМ МАНЭЎРАМ КЛЯСАВАГА ВОРАГА, ГЭТЫМ НОВЫМ ПРЫЁМАМ ЯГО БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ КАЛГАСНАГА ЛАДУ МЫ АБАВЯЗАНЫ СУПРОЦЬПАСТАВІЦЬ МАКСЫМАЛЬНАЕ ЎЗМАЦНЕНЬНЕ БАЛЬШАВІЦКАЙ ПІЛЬНАСЬЦІ.

Іменна ў парадку мабілізацыі гэтай бальшавіцкай пільнасьці ўказаў тав. СТАЛІН у сваёй прамове «Аб рабоце ў вёсцы» на тое, што:

«Не заўважваючы клясавага ворага ў яго новай масцы і нлўмеючы выкрываць яго машэньніцкіх махінацый, некаторыя нашы таварышы нярэдка супакойваюць сябе тым, што кулакоў ужо няма, нібыта, на сьвеце, што антысавецкія элемэнты ў вёсцы ўжо зьнішчаны... Але гэта глыбокая памылка, таварышы, купакі разьбіты, але яны далёка яшчэ не дабіты. Больш таго—яны ня скора яшчэ будуць дабіты, калі камуністы будуць зяваць і благадушнічаць, мяркуючы што купакі самі сойдуць у магілу ў парадку, так сказаць, стыхійнага свайго разьвіцьця».

Расьсьледваньне дзейнасьці шкодніцкіх арганізацый на розных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва на Украіне цалкам і поўнасьцю гэтыя словы тав. СТАЛІНА пацьвярджае.

Шкодніцкая арганізацыя ў галіне сельскай гаспадаркі пусьціла надзвычай разгалінаваныя карэньні і арудавала як у сыстэме зямельных органаў, так і ў радзе МТС і калгасаў, прабуючы падарваць і зьвесьці на нішто нашу работу па ўмацаваньні калгаснага ладу.

Яны — шкодзікі—умела расставілі свае сілы на важнейшых вучастках і фактычна ў цэлым радзе месц запраўлялі. Усе дырэктывы ЦК адсоўваліся, скажаліся, перарабляліся, да месц не даходзілі, а на мясцох, дзе гэтыя ворагі нярэдка сядзелі, і што траплала ім у рукі накіроўвалася ясна не на карысьць, а на шкоду калгаснаму ладу.

Дзе прычына таго, што гэтыя шкодні кі маглі беспакарна рабіць сваю антысавецкую справу? Прычына ў няхватцы, а часамі і ў поўнай страце некаторымі нашымі партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі бальшавіцкай пільнасьці.

На Украіне шкодніцкая работа ў галіне сельскай гаспадаркі цесна перапліталася са шпіёнскай дзейнасьцю па заданьнях контр-разьведак некаторых дзяржаў і шкодніцкай работай у галіне культурнага будаўніцтва. А культурнае-ж будаўніцтва на Украіне, гэты важнейшы фактар ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, мае самыя простыя і непасрэдныя адносіны да ўсёй нашай штодзённай барацьбы за далейшы ўздым сельскай гаспадаркі, за завяршэньне ня сацыялістычнай рэканструкцыі, за ўмацаваньне калгаснага ладу.

Пралезшы на некаторыя вучасткі культурнага будаўніцтва, на самыя адказныя пасты, усе гэтыя Баданы, Максімовічы, Яворскія, Эрэцціянкі і іншыя шкоднікі і шпіёны выкарысталі гэта для расстаноўкі сваіх людзей і насаджвалі, зразумела, ня нашу культуру, нацыянальную па форме, сацыялістычную, пралетарскую па зьместу, а культуру буржуазную, культуру Данцовых, Яфрамавых, Груцэўскіх, гэтым шляхам прабуючы ўзьняць працоўнае сялянства супроць пралетарыяту і яго авангарду—партыі бальшавікоў.

Украінская партыйная арганізацыя на працягу ўсёй сваёй гісторыі праводзіла жорсткую барацьбу супроць вялікадзяржаўнага шавінізму і супроць украінскага нацыяналізму. Украінская партыйная арганізацыя пад кіраўніцтвам тав. КАГАНОВІЧА яшчэ некалькі год назад выкрыла шумскізм, як агентуру клясавага ворага, выкінула з Украіны Шумскіх, Сападубаў і Максімовічаў. Іх прыяцелі і спадзяжнікі, працаваўшыя ў КПЗУ — Васільковы, Турэнскія і інш., ужо тады былі выкрыты, як агенты польскага фашызму. Гэтай слаўнай, адной з лепшых старонак у гісторыі нашай партыйнай арганізацыі ні ў якім выпадку нельга замазваць або забываць.

Аднак, пільнасьць украінскай партыйнай арганізацыі за апошні час, на жаль, аслабла. Вы паглядзеце, напрыклад, масавую літаратуру, якую тыражамі ў сотні тысяч накіроўвалі ў 1931-32 г. г. у калгасную вёску. Сярод гэтых-жа брошур і кніжак вы натрапіце на немалую колькасьць такіх, у якіх воўчыя вочы ворага так і глядзяць на вас з радкоў. Вялізарнейшую нашу зброю, зброю нашай агітацыі і прапаганды вораг нярэдка ўхітраўся, седзячы ў нашых-жа апаратах і карыстаючыся нашымі-ж матар'яльнымі рэсурсамі, скарыстаць супроць партыі, супроць савецкай улады, супроць калгаснага ладу.

Гэтыя вораг зараз выкрыт і разгромлен, але трэба пэрад сабой паставіць пытаньне—чаму гэтыя заклятыя ворагі нашы, гэтыя пятлюраўцы, шпіёны, шкоднікі мелі магчымасьць арудаваць на адказнейшых вучастках такога сур'ёзнага фронту, як фронт культурнага будаўніцтва? Прычына тут зноў-такі ў страце бальшавіцкай пільнасьці некаторымі, нават вельмі адказнымі таварышамі.

Нейчна было-б думаць, што тут ужо ўсё расчышчана. Варожыя элемэнты яшчэ далёка ня выкарчаваны, мы яшчэ далёка ня выпалілі ўсяго гэтага контрраволюцыйнага шкодніцкага гнязда. Карэньні гэтай арганізацыі яшчэ ёсьць і ў нашых зямельных арганізацыях, і ў нізу— у МТС і ў калгасах. Ворагі пайшлі глыбей, але яны праводзяць далей сваю шкодніцкую дзейнасьць. Вось нядаўна выкрыты ў адной МТС такога шкодніка, які сядзеў там намесьнікам дырэктара і спэцыяльна са шкодніцкай мэтай прымацоўваў калгасы і вытворчыя вучасткі, якія знаходзяцца ад бліжэйшых нафтапунктаў за 10-15 кілёмэтраў, да нафтапункту, які знаходзіцца на адлегласьці 40-50 кілёмэтраў.

Прыдзецца яшчэ выяўляць і граміць шкодніцкія элемэнты і на вучастках культурнага будаўніцтва. Клясавы вораг ужо стараецца грэць на гэтым, прабуючы паказаць гэту бальшавіцкую барацьбу супроць пятлюраўскіх, махноўскіх, шпіёнскіх, шкодніцкіх, шавіністычных элемэнтаў, засеўшых на радзе вучасткаў культурнага будаўніцтва, як пахід на украінскую культуру.

Гэтыя варожыя элемэнты адчуваілі сябе да апошняга часу настолькі свабодна на Украіне, што некаторыя з іх рашаюцца нават даволі актыўна і нагла агрызацца на нашы мерапрыемствы па разгроме пятлюраўскіх, шавіністычных, шпіёнскіх і шкодніцкіх элемэнтаў.

Вось гэтымі дням у Прамысловай акадэміі выступіў нейкі Палонскі, беспартыйны выкладчык украінскай мовы і нават старшыня цыклявай камісіі па украінскай мове. Ён выступаў наконт артыкулу, зьмешчанага ў газэце «Камуніст», аб становішчы на мовазнаўчым фронце. Дык вось гэты варожы агент настолькі абнаглеў, што з савецкай трыбуны ён выступіў з такога роду заявай:

«Пасьля Скрыпніка пачаўся разрыў з галіцыйскай культурай. Трэба змагацца супроць рускага шавінізму, бо нават УНДО за граніцай піша, што пасьля Скрыпніка ідзе русыфікацыя на Украіне».

Выходзіць, што пакуль Баданы, Яворскія, Максімовічы і іншыя пятлюраўцы, шавіністы і шпіёны ў выніку прытуленьня бальшавіцкай пільнасьці ў нашых партыйных і камсамольскіх арганізацыях свабодна арудавалі і насаджвалі чужую, варожую нам буржуазную, нацыяналістычную культуру, да таго часу мы, паводле Палонскага, розводзілі украінскую культуру. А калі-ж партыя цяпер, у барацьбе за ленінскую нацыянальную палітыку, за украінскую культуру, нацыянальную па форме і пралетарскую па зьместу, узялася за ачыстку культурна-ідэалёгічнага вучастку ад гэтых шкодніцкіх, антысавецкіх, шавіністычных элемэнтаў, то, паводле Палонскага, выходзіць, што мы пачалі русыфікацыю Украіны. У вуснах ворага гэта ў поўнай меры лёгічна. Бо Палонскія-ж лічаць украінскай культурай не савецкую, нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьместу украінскую культуру, а культуру буржуазную, накіраваную на адрыў Савецкай Украіны ад Савецкага саюзу.

Але катое ён і вораг. Недарма спасылаецца ён на такі «аўтарытэт», як УНДО, бач, «нават УНДО піша ўжо...» Пралетары і калгасная маса добра ведаюць, што прадстаўляе сабою УНДО. Яны дасканала ведаюць, што палітыка УНДО — гэта палітыка рэстаўрацыі капіталізму на Украіне, палітыка звароту капіталістаў і памешчыкаў, палітыка кабалы, эксплёатацыі і зьдзіску для працоўных Украіны, палітыка фізычнага зьнішчэньня мільёнаў рабочых і сялян.

Вораг прабуе схавацца за сьпіну тав. СКРЫПНІКА. Гэта лішні раз гаворыць нам аб сур'ёзнейшых памылках тав. Скрыпніка як у яго пітарытурнай работа па нацыянальным пытаньні і культурным будаўніцтве, так і ў яго практычнай рабоце па кіраўніцтве сыстэмай асьветы на Украіне.

Але даромна прабуе і цяпер яшчэ вораг схавацца за сьпіну тав. Скрыпніка. Цяпер сам тав. Скрыпнік трэ сваю сьпіну жорсткай мачалкай, але не асабліва моцна націскае, прыдзецца дапамагчы яму крыху. (СЬМЕХ, АПЛЁДЫСМЭНТЫ).

Трэба ўскрыць усе памылкі, дапушчаныя тав. Скрыпнікам у яго работах. Неабходна разам з тым ускрыць і выкінуць тыя антымаркысцкія, антыленінскія палажэньні, якія працягваліся на розных вучастках на ідэалёгічных франтох школьнай тав. Скрыпніка.

НАША ПАРТЫЯ ЗАЎСЁДЫ ВЯЛА І НАДАЛЕЙ БУДЗЕ ВЕСЬЦІ Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ПЫТАНЬНІ І Ў ПРАКТЫЦЫ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ САМУЮ НЕПРЫМІРЫМУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ БАРАЦЬБУ НА ДВА ФРОНТЫ, ЯК СУПРОЦЬ ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНАГА ШАВІНІЗМУ, ЯКІ ЗАСТАЕЦЦА І НАДАЛЕЙ ГАЛОЎНАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ У НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ПЫТАНЬНІ, ТАК І СУПРОЦЬ НАЦЫЯНАЛ-ШАВІНІЗМУ. ПАРТЫЯ ЗАЎСЁДЫ ЗМАГАЛАСЯ І НАДАЛЕЙ БУДЗЕ ВЕСЬЦІ САМУЮ НЕПРЫМІРЫМУЮ БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ УСЯКІХ ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНІЦКІХ ЭЛЕМЭНТАЎ. АЛЕ ПАРТЫЯ РАЗАМ З ТЫМ ГРАМІЛА І БУДЗЕ ГРАМІЦЬ УСЯКІЯ ШАВІНІСТЫЧНЫЯ, ПЯТЛЮРАЎСКІЯ ЭЛЕМЭНТЫ, У ЯКІЯ-Б МАСКІ ЯНЫ НЕ ПРЫБІРАЛІСЯ.

Знаходзяцца, аднак, і цяпер пасобныя камуністы, і нават вельмі адказныя работнікі, якія не разумеюць або ня хочуць зразумець мерапрыемстваў партыі па разгроме гэтых пятлюраўскіх буржуазна-нацыяналістычных элемэнтаў. Іншыя памоўчваюць наконт сваіх настроў у сувязі з гэтымі мерапрыемствамі, толчы ўнутры сябе няўхвалу або злагоду з гэтымі мерапрыемствамі, а іншыя проста гавораць аб гэтым. Вось нядаўна прыслаў у ЦК ліст тав. Сірко Івон, былы сакратар абкому АМССР. Праўда, ён потым прызнаў памылковасьць гэтага ліста і ад яго адмовіўся. Аднак, гэты ліст вельмі характэрны для настроя пасобных, нават вельмі адказных таварышоў. Яжа ён малюе ў гэтым сваім лісьце мерапрыемствы партыі па разгроме буржуазна-нацыяналістычных і шпіёнскіх элемэнтаў? У яго атрымлівацца, што гэта нібыта пахід на галічан: валяць, бачыце, усіх у адну кучу.

АНТЫПАРТЫЙНАЯ ГЭТА БАЛБАТНЯ, ПАДКАЗАНАЯ КЛЯСАВЫМ ВОРАГАМ. Прычым тут галічане? КП(б)У заўсёды падтрымлівала і высоўвала на кіруючую работу лепшыя партыйныя кадры, якія выйшлі з Галіцыі. КП(б)У заўсёды з вялізарнейшай сымпатыяй сачыла і сочыць за гераічнай барацьбой нашай брацкай кампартыі Заходняй Украіны.

Але партыя таксама, як яна бязьлітасна праміла Руціных, Каюравых, Стэнаў, Мерэцкіх, Эйсмонтаў, як ворагаў сацыялістычнага будаўніцтва, таксама яна самым жорстким чынам біла і будзе біць варожыя элемэнты, якія прабуюць прыкрыць сваю варожую работу рознымі нацыянальнымі матывамі.

Якая ў канчатковым выніку клясавая розьніца паміж Эйсмонтамі, Каюравымі, Шумскімі і Саладубамі? Ніякай. І тыя, і другія зьяўляліся агентурай клясавага ворага ў нашай партыі, агентурай, якая накіроўвала сваю работу на падрыў магутнасьці пралетарскай дыктатуры і зрыў сацыялістычнага будаўніцтва.

Вы бачыце, як клясавы вораг прабуе паказаць мерапрыемствы партыі па разгроме шавіністычных, шкодніцкіх, контр-рэвалюцыйных элемэнтаў, засеўшых на розных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва на Украіне. Вы бачыце, як іншыя камуністы зьбіваюцца з партыйных пазыцый і трапляюць у палон гэтай варожай агітацыі.

Партыя самым жорстким чынам будзе выкарчоўваць усё варожае, чужое, нацыяналістычнае, шавіністычнае, што прасякае ў яе рады. Але партыя разам з тым ніколі ня стрыгла і ня стрыжа пад адзін грабень. МЫ АБАВЯЗАНЫ АДРОЗЬНІВАЦЬ ВОРАГАЎ І ГНІЛЫЯ ЭЛЕМЭНТЫ, ЯКІЯ ЎТОЙВАЮЦЬ СВАЮ НЯЗГОДУ З ЛІНІЯЙ ПАРТЫІ І ЗРОШЧВАЮЦЦА З КЛЯСАВЫМ ВОРАГАМ, АД ТАВАРЫШОЎ, ДАПУСЬЦІЎШЫХ ПАМЫЛКІ І АБЛЫТАНЫХ КЛЯСАВЫМ ВОРАГАМ.

Бо неабходна ўлічыць, што на працягу раду год усе гэтыя Яворскія, Баданы высоўваліся на кіруючыя работы, яны гралі першую скрыпку на пасобных вучастках ідэалёгічнага фронту, яны рэдагавалі нямала сур'ёзьнейшых выданьняў, іх папулярызавалі, ім ставралі аўтарытэт і імл.

Тут вялікая памылка і аппошнасьць з боку некаторых кіруючых таварышоў, даўшых ход і падтрымаўшых гэтыя варожыя элемэнты.

Бо гэтыя-ж пятлюраўскія элемэнты ідэалёгічна ўплывалі на пасобных нашых таварышоў, вялі іх за сабой, выхоўвалі іх, аблытвалі іх.

Пасобныя таварышы, нават сумленныя камуністы, пакуль яшчэ ня здолелі выблытацца з гэтага варожага ўплыву. Трэба гэтым таварышом дапамагчы выправіць свае памылкі, паказаць ім сапраўдны твар тэй ідэалёгіі, якую насаджвалі гэтыя пятлюраўцы, а галоўнае, не валіць усіх у адну кучу, ня стрыгчы ўсіх пад адзін грабень.

Гэта было-б на руку толькі ворагу. Вораг якраз і зацікаўлен у тым, каб пад удар траплялі нашы людзі, якія ня раз даказалі сваю адданасьць лініі партыі, але дапусьцілі цяпер сур'ёзныя памылкі, дазволілі сябе аблытаць клясаваму ворагу. Клясавы вораг тым самым атрымаў-бы магчымасьць паказаць нашу барацьбу супроць шавіністаў, шкодніцаў і шпіёнаў, як суцэльны пахід, і адцягнуў-бы нашу ўвагу ад сапраўдных ворагаў.

Ня выключана, што вораг для таго, каб ухіліцца ад удару, папрабуе прадставіць сваю шкодніцкую работу, як простую памылку. Вось Палонскі, кажуць ужо выступаў з пакаяннымі прамовамі. Больш чым праўдаподобна, што і ліпіль з партыйным білетам будзе прабаваць захаваць сваю партыйную работу пад пакаяннымі дэкларацыі. Трэба прадбачыць усе гэтыя манэўры клясавага ворага і супроцьпаставіць ім усямерную павышэньне бальшавіцкай пільнасьці.

Бязумоўна трэбе мець на ўвазе, што вялікадзяржаўніцкія элемэнты будуць прабаваць зараз падымаць галаву, выступаючы ў сваіх інтарэсах разгром буржуазна-нацыяналістычных, шавіністычных элемэнтаў. Ужо дзе-ні-дзе пачынаюцца гутарачкі, што, моў, скончылася папаса украінізацыі. Прабуюць ехаць і апяганіць усю тую вялізарнейшую работу па нацыянальна-культурным будаўніцтве, якую прарабіла і вядзе зараз наша партыя.

МЫ ПАВІННЫ З ГЭТЫМІ ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНІЦКІМІ ЭЛЕМЭНТАМІ ВЕСЬЦІ САМУЮ РАШУЧУЮ НЯЎМОЛЬНУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ БАРАЦЬБУ, МЫ НІ НА ХВІЛІНУ НЕ ПАВІННЫ ЗАБЫВАЦЬ УКАЗАНЬНЯЎ ТАВ. СТАЛІНА НА XVI ЗЬЕЗЬДЗЕ ПАРТЫІ НА ТОЕ, ШТО:

«... Мы ўжо ўступілі ў пэрыяд сацыялізму... І ўсё-ж, ня гледзячы на гэта, нацыянальныя мовы ня толькі не адмяраюць і ня зьліваюцца ў адну агульную мову, а наадварот, нацыянальныя культуры і нацыянальныя мовы разьвіваюцца і расьцьвітаюць...»

«Тэорыя зьліцьця ўсіх нацый, скажам, СССР, у адну агульную ВЯЛІКАРУСКУЮ нацыю з адной агульнай ВЯЛІКАРУСКАЙ мовай ёсьць тэорыя нацыянал-шавіністская, тэорыя антыленінская, якая супярэчыць асноўнаму палажэньню ленінізму, якое заключаецца ў тым, што нацыянальныя розьнасьці ня могуць зьнікнуць ў бліжэйшы перыяд, што яны павінны застацца яшчэ надоўга нават пасьля перамогі пралетарскай рэвалюцыі ў СУСЬВЕТНЫМ МАШТАБЕ».

Гэтыя прынцыпы ленінскай нацыянальнай палітыкі партыя заўсёды праводзіла і будзе праводзіць з усёй бальшавіцкай пасьлядоўнасьцю і няўхільнасьцю.

БУЙНАЯ ПЕРАМОГА ПАЛІТЫКІ СССР

КАНВЭНЦЫЯ 8 КРАІН ПА АКРЭСЬЛЕНЬНІ АГРЭСАРА

ЛЁНДАН, 3. (БЕЛТА). Сёньня ў 18 гадзін у будынку паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Лёндане прадстаўнікамі 8 краін падпісана наступная канвэнцыя:

КАНВЭНЦЫЯ АБ АЗНАЧЭНЬНІ АГРЭСІІ

ЦВК СССР, яго вялікасьць кароль Аўганістану, прэзыдэнт Эстонскай рэспублікі, прэзыдэнт Латвійскай рэспублікі, яго вялікасьць Пэрсыдзкі шах, прэзыдэнт Польскай рэспублікі, яго вялікасьць кароль Румыніі і прэзыдэнт Турэцкай рэспублікі, прасякнутыя жаданьнем ўзмацніць існуючы паміж іх краінамі мір,

лічачы, што пакт Брыяна-Келёга, удзельнікамі якога яны зьяўляюцца, забараняе ўсякую агрэсію,

мяркуючы неабходным у інтарэсах усеагульнай бясьпечнасьці азначыць як мага дакладней паняцьце агрэсіі для устараненьня ўсякага поваду да не апраўданьня,

канстатуючы, што ўсе дзяржавы маюць роўнае права на незалежнасьць, бясьпечнасьць, абарону сваёй тэрыторыі і свабоднае разьвіцьцё свайго дзяржаўнага ладу,

адухаўлёныя жаданьнем у інтарэсах усеагульнага міру забясьпечыць усім народам недатыкальнасьць іх краін,

знаходзячы карысным у інтарэсах усеагульнага міру ўвесьці ў дзеяньне паміж сваімі краінамі дакладныя правілы азначэньня агрэсіі да універсальнага прыменьня гэтых правіл, па рашылі ў гэтых мэтах заключыць даную канвэнцыю і для гэтага належным чынам упаўнаважылі: ЦВК СССР —Максіма Літвінава, народнага камісара па замежных справах; яго вялікасьць кароль Аўганістану—Алі Махамэд Хана, міністра народнай асьветы, прэзыдэнт Эстонскай рэспублікі—доктара Аскара Капаса, надзвычайнага пасланьніка і паўнамоцнага міністра ў Лёндане; прэзыдэнт Латвійскай рэспублікі—п. Вальдэмарэса Сальнайса, міністра замежных спраў; яго вялікасьць Пэрсыдзкі шах—Фатола Хана Нуры Эсфэндыяры, паверанага ў справах у Лёндане; прэзыдэнт Польскай рэспублікі—п. Эдуарда Рачынскага, па стаяньніка прадстаўніка Польшчы пры Лізе Нацый і надзвычайнага пасланьніка і паўнамоцнага міністра, яго вялікасьць кароль Румыніі—п. Нікалая Тытулеску, міністра замежных спраў; прэзыдэнт Турэцкай рэспублікі — Тэфік Рушцю-Бэя, міністра замежных спраў, якія згадзіліся аб наступных пастановах:

АРТЫКУЛ 1-ы

Кожны з высокіх дагаворных бакоў абавязваецца прыпадаць у сваіх узаемаадносінах з кожным з астатніх, пачынаючы з дня ўступленьня ў сілу даной канвэнцыі, вызначэньне нападаючага боку, растлумачанае ў дакладзе камітэту па бясьпечнасьці ад 24-га мая 1933 г. (даклад Політыса) на канферэнцыі па разабраньні, зробленае на падставе прапановы савецкай делегацыі.

АРТЫКУЛ 2-гі

У адпаведнасьці з гэтым будзе прызнана нападаючым бокам у міжнародным канфлікце, з улікам згод, якія дзейнічаюць паміж уцягнутымі ў канфлікт бакамі,—дзяржава, апрабіўшая першаю дно з наступных дзеяньняў:

1. Абвяшчэньне вайны другой дзяржаве.

2. Напад узброеных сіл, хоць-бы і без абвяшчэньня вайны, на тэрыторыю іншай дзяржавы.

3. Напад сухаземных, марскіх ці паветраных узброеных сіл, хоць-бы і без абвяшчэньня вайны, на тэрыторыю, марскія ці паветраныя судны другой дзяржавы.

4. Морская блёкада бераговуй ці партоў другой дзяржавы.

5. Дапамога ўзброеным бандам, арганізаваным на ўласнай тэрыторыі і нападаючым на тэрыторыю іншай дзяржавы, або адмаўленьне, ня гледзячы на патрабаваньні падпаўшай нападзе дзяржавы, прыняць на ўласнай тэрыторыі ўсе магчымыя меры для пазбаўленьня названых банд усякай дапамогі ці апекі.

АРТЫКУЛ 3-ці

Ніякія мяркаваньні палітычнага, ваеннага, эканамічнага ці іншага парадку ня могуць служыць дараваньнем, ці апраўданьнем нападу, прадугледжанага ў артыкуле 2-м у якасьці прыкладу. (Гледзі дадатак).

АРТЫКУЛ 4-ы

Даная канвэнцыя будзе ратыфікавана высокімі дагаворнымі бакамі адпаведна законадаўству кожнай з іх. Ратыфікацыйныя граматы будуць аданы на хаваньне кожным з высокіх дагаворных бакоў ураду СССР.

Як толькі ратыфікацыйныя граматы будуць аданы на хаваньне двума з высокіх дагаворных бакоў, даная канвэнцыя ўступіць у сілу паміж гэтымі двума бакамі. Для ўсіх астатніх высокіх дагаворных бакоў яна будзе уступаць у сілу па меры здачы імі ў сваю чаргу ратыфікацыйных грамат на хаваньне.

Кожная здача на хаваньне ратыфікацыйных грамат будзе неадкладна даводзіцца ўрадам СССР да ведама ўсіх удзельнікаў даной канвэнцыі.

АРТЫКУЛ 5-ы

Даная канвэнцыя складзена ў 8-мі экзэмплярах, па аднаму з якіх уручаецца кожнаму дагаворнаму боку, у сьведаньне чаго вышэй пералічаныя ўпаўнаважаныя падпісалі даную канвэнцыю і змацавалі яе сваімі пячаткамі.

Учынена ў Лёндане 3-га ліпеня 1933 г.

Максім Літвінаў.
Алі Махамэд Хан.
Оскар Капас.
Вальдэмарас Сальнайс.
ФатоллА Хан Нуры Эсфэндыяры.
Эдуард Рачынскі.
Нікалай Тытулеску.
Тэфік Рушцю-Бэй.

ДАДАТАК ДА АРТЫКУЛУ 3-ГА АБ АЗНАЧЭНЬНІ АГРЭСІІ

Высокія дагаворныя бакі, падпісаўшыя канвэнцыю аб азначэньні агрэсіі, жадаючы—пры захаваньні поўнай недатыкальнасьці абсалютнага значэньня правіла, сфармуляванага ў артыкуле 3-м названай канвэнцыі—даць некаторыя ўказаньні, якія-б дазвалялі азначыць нападаючы бок,

устанаўляюць, што ні адна з пералічаных ніжэй акалічнасьцей ня зможа, між іншым, быць праведзена ў апраўданьне якога-небудзь акту агрэсіі ў сэнсе артыкулу другога названай канвэнцыі.

Унутраное становішча якой-небудзь дзяржавы, як напрыклад: ня палітычны, эканамічны і сацыяльны лад; мінімы недахопы яе адміністрацыі беспарадкі, якія зьяўляюцца вынікам забастовак, рэвалюцыйных ці контр-рэвалюцыйных рухаў і грамадзянскай вайны; міжнародныя паводзіны якой-небудзь дзяржавы, як напрыклад: пару шэньне, ці пагроза парушэньня матар'яльных або маральных праў ці інтарэсаў замежнай дзяржавы ці яе грамадзян; разрыў дыпляматычных ці экан

Менская партарганізацыя павінна паказаць узоры правядзеньня чысткі

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б—старшыні Менскай гарадзкой камісіі па чыстцы КП(б)Б тав. РЫСКІНА на пленуме Менскага гаркому КП(б)Б

НА ВЫСОКІМ ІДЭЁВА-ПАЛІТЫЧНЫМ УЗРОЎНІ

ТАВАРЫШЫ! Менская партыйная арганізацыя пытаньні, зьвязаныя з задачамі чысткі, прапрацоўвала ня раз. Выбіралі два разы актывы, дзе і тав. **ЛЫЧОЎ**, і тав. **АНЦІПАЎ**, і тав. **ГІКАЛО** гаварылі аб задачах чысткі. Гэтыя пытаньні прапрацоўваліся на сходах партыйных ячэек. Склікаліся нарады сакратароў партколектываў з праверкомамі ў сувязі з падрыхтоўкай і ходам чысткі партыйных арганізацый.

Таму, мне думаецца, ня ўданым пасьледняму разу патрэбы паўтараць аб агульных задачах чысткі. Я зраблю толькі пазнаёмленьне аб тым, як у нас у Менску праходзіць чыстка партыйных арганізацый.

НЕДАХОПЫ ПАДРЫХТОЎЧАЙ РАБОТЫ

Мы шукаць праверылі ўсяго толькі 1.400 чалавек, а агульная колькасьці 14.500 чалавек менскай партыйнай арганізацыі. Такім чынам, мы знаходзімся толькі ў пачатку разгортваньня работы па чыстцы менскай партарганізацыі і ў сувязі з гэтым можна зрабіць толькі папярэднія вывады аб ходзе чысткі па невялікай групе ячэек. Тым ня менш, таварышы, гэтыя папярэднія вывады неабходна ведаць усяму актыву і ўсёй менскай партыйнай арганізацыі. Неабходна ведаць таму, што мы пакуль што праверылі 12 проц. менскай партыйнай арганізацыі і, значыць, амаль дзесяць дзесятых працэтаў яшчэ перад чысткай. Неабходна ведаць, і таму, што ў працэсе чысткі мы выявілі рад буйнейшых недахопаў у партыйнай рабоце якія павінны быць неадкладна ўлічаны з тым, каб зрабіць адсюль рад вываду, гарантуючых нам правядзеньне чысткі ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі.

Я хачу вам напомніць, як сфармуляваны асноўныя задачы па чыстцы ў пастанове ЦК і ЦКК УсеКП(б).

«Задача чысткі партыі заключаецца ў павышэньні ідэалёгічнага ўзроўню членаў партыі, у палітычным і арганізацыйным умацаваньні партыі, далейшым узмацненьні давер'я да партыі мільёнаў беспартыйных мас. Гэта задача ажыцьцяўляецца пры чыстцы шляхам:

а) правядзеньня адкрытай і сумленнай самакрытыкі членаў партыі і партыйных арганізацый;

б) праверкі работы кожнай партыйнай ячэйкі з пункту гледжаньня выкананьня рашэньняў і ўказаньняў партыі;

в) прыцягненьня да справы чысткі працоўных беспартыйных мас і

г) вычышчэньня з партыі людзей, якія не апраўдваюць высокай годнасьці члена партыі».

Такім чынам, задачы партыйных арганізацый і камісій па чыстцы зусім ясныя.

Гэтыя задачы, што стаяць перад усёй партыйнай арганізацыяй, самі сабою вызначаюць, стаяць у канкрэтнай форме перад кожнай ячэйкай у паасобку. Гэтыя задачы патрабуюць вялікай падрыхтоўчай работы да чысткі і бальшавіцкай арганізаванасьці ў ходзе самой чысткі. У гэтым сэнсе трэба падкрэсьліць, што адказнасьць як за падрыхтоўку да чысткі, так і ва ўсёй рабоце ў час чысткі, ляжыць ня толькі на праверачных камісіях па чыстцы, але і, галоўным чынам, на партыйных арганізацыях.

Я гэтым хачу сказаць, што партыйным арганізацыям ня проба чакаць, пакуль будзе абвешчана дата чысткі даная ячэйкі або адпаведнай партыйнай арганізацыі. Партыйныя арганізацыі і ўсе ячэйкі абязаны былі разгарнуць падрыхтоўчую работу неадкладна пасьля апублікаваньня пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б), падрыхтаваць да чысткі як партыйную арганізацыю, так і беспартыйных рабочых, прычым удзел апошніх зьяўляецца вельмі неабходным за ўсіх працэсах правядзеньня чысткі нашых партыйных радоў.

Я гэта падкрэсьліваю таму, што вопыт першых дзён чысткі паказвае недавальняючую, а з боку паасобных ячэек — проста ацёдную падрыхтоўку да чысткі.

Як менская арганізацыя ў цэлым рыхтавалася да правядзеньня чысткі?

Хаця першая пастанова ЦК аб чыстцы была прынята ў сьнежні 1932 г., а пастанова ЦК УсеКП(б) аб чыстцы партыйных радоў была ўхвалена на студзеньскім аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК у 1933 г., потым разгорнутая пастанова па пытаньнях чысткі была апублікавана ЦК і ЦКК УсеКП(б) у красавіку гэтага году, — аднак, менская партыйная арганізацыя фактычна пачала рыхтавацца да чысткі прыблізна ў другой палове мая гэтага году. Такім чынам, менская партыйная арганізацыя **СА ЗНАЧНЫМ СПАЗЬНЕНЬНЕМ** пачала праводзіць работу, зьвязаную з падрыхтоўкай падчыннай арганізацыі да чысткі.

Аднак, неабходна прызнаць, што за гэты параўнальна невялікі перыяд часу да пачатку пэрсанальнай чысткі менскай партыйнай арганізацыяй была праведзена адпаведная масавая растлумачальная работа аб мэтах і задачах чысткі і азнаямленьня членаў партыі і беспартыйных з інструкцыяй цэнтральнай камісіі па чыстцы і радам іншых дакумэнтаў, зьвязаных з падрыхтоўкай да падыходзячай чысткі партыі. Узмацнілася партыйная вучоба, галоўным чынам па вывучэньні праграмы і статуту партыі і арганізацыйных прынцыпаў бальшавізму. **АЛЕ НЯ ЎСЕ ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ ПРАВОДЗІЛІ ГЭТУ РАБОТУ НАЛЕЖНЫМ ЧЫНАМ.** Мы маем рад партыйных ячэек, якія да правядзеньня гэтай вельмі адказнай і важнай работы падышлі фармальна, што бясспрэчна дало сябе адчуваць у працэсе самой работы па чыстцы.

ПАД ЗНАКАМ УЗДЫМУ УСЁЙ НАШАЙ РАБОТЫ

Што мы можам зараз, на вопыце работы камісій па чыстцы на працягу 2-х тыдняў, адзначыць станоўчае?

Перш за ўсё я павінен указаць на тое, як партыйная і беспартыйная маса сустрэлі чыстку партыйных радоў. Па ўсіх нашых высьвятленьнях і назіраньнях усіх праверачных камісій можна прысьці да цьвёрдай упэўненасьці, што **ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ, БЕСПАРТЫЙНАЯ МАСА РАБОЧЫХ І АСНОЎНАЯ МАСА КАЛГАСЬНІКАЎ СУСТРЭЛІ ПАСТАНОВУ ЦК І ЦКК ПА ПЫТАНЬНІ ЧЫСТКІ З ВЯЛІКІМ ЗДАВАЛЬНЕНЬНЕМ.** Мы маем рад фактаў, якія характарызуюць выключна добрыя адносіны працоўных мас да пастановы партыі і да гэтай работы, чакая правядзеньня зараз у сувязі з чысткай партыйных радоў.

Па-другое, можна канстатаваць, што правядзеньная работа па чыстцы ў значнай меры **ПАВЫСІЛА АКТЫЎНАСЬЦЬ ЯК ЧЛЕНАЎ ПАРТЫІ, ТАК І БЕСПАРТЫЙНЫХ РАБОЧЫХ І КАЛГАСЬНІКАЎ.**

Па-трэцяе, неабходна адзначыць, што мы маем **НЕКАТОРАЕ ЎЗМАЦНЕНЬНЕ Ў РАЗГОРТВАНЬНІ КРЫТЫКІ І САМАКРЫТЫКІ.**

Чацьверты станоўчы фактар, што адзначаецца ўсёй нашымі камісіямі, гэта тое, што мы маем у апошні час, пачынаючы з моманту апублікаваньня пастановы ЦК аб чыстцы, **БЯССПРЭЧНЫ РОСТ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЬЦЬ, ПАВЯЛІЧАНЬЯ ЗАПАТРАБАВАНЬНІ ЧЛЕНАЎ ПАРТЫІ І САПРАЎДНЫ ЗРУХ У СЭНСЕ РАБОТЫ НАД САБОЙ, У ПАВЫШЭНЬНІ ПАЛІТЫЧНАГА І ТЭАРЫТЫЧНАГА ЎЗРОЎНЮ.** Зусім зразумела, што члену партыі, які шэраг год не працаваў над сабой, вельмі цяжка навярстаць гэта ў працягу месяца, паўтара ці двух. Аднак, не падлягае ніякаму сумненьню, што, прыблізна паўгадовы нарыяд чысткі партыі дасьць магчымасьць штуршок і канкрэтныя разультаты ў сэнсе падрыхтоўкі партыйных кадраў, у сэнсе павышэньня палітычнага і тэарытычнага ўзроўню партыі.

І, нарэшце, зусім бясспрэчны факт — гэта **ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ ВЫТВОРЧАЙ АКТЫЎНАСЬЦІ ЯК ПААСОБНЫХ ЧЛЕНАЎ ПАРТЫІ, ТАК І АСОБНЫХ ПАРТЫЙНЫХ ЯЧЭЕК, АСОБНЫХ ВЫТВОРЧЫХ КАЛЕКТЫВАЎ, ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ У ЦЭЛЫМ.**

З газэт вы ўжо ведаеце аб вопыце сакратароў партколектываў з праверкомамі ў сувязі з падрыхтоўкай і ходам чысткі партыйных арганізацый.

1

сіі вычышчаюць.

На электрастанцыі «камуніст» **Крутко**, У 1921 г. ужо быў выключан з партыі, як сам гаворыць «па нявучасьці», бо ў яго знайшлі залатыя манеты. Гэты «камуніст» аказвае і цяпер дапамогу нядому, арыштаванаму органамі АДПУ. Рэдактар газэты на Эльводзе **Купрынскі** — сын кулака, хадайнічае аб скасаваньні індывідуальнага ападат каманьня свайго бацькі. **Шабуневіч** узначаліў прушаўшчыну, сямейнасьць, п'янства сярод групы партыйцаў і беспартыйных рабочых на Эльводзе. Ён спэцыяльным загадам, будучы начальнікам цэху, скасаваў выдзельшчыну ў цэху.

На фабрыцы **«Камунарка» — Фрыдлянд**, член партыі з 1927 г., старшыня фабкому — сын ліпэнца. Гэты Фрыдлянд, будучы старшынёю фабкому, разваліў работу фабрычна-заводзкага ка-

На заводзе імя **Мясьнікова — Сазонаў** тры разы выключаўся з партыі. На вытворчасьці свайго пляну ніколі ня выконваў, агітаваў супроць савецкай улады.

На **«Бальшавіку»** нам. начальніка машыннага цэху **Шымончык** увесь час угоўваў, што ён у мінулым гандляваў і эксплёатаваў наёмную сілу. Работніцы, якія на яго працавалі, яго вы крылі.

На **малочным заводзе — Абрамоўскі**, сын б. памешчыка. Бацькі яго былыя ўласьнікі гасьцініцы да 1928 г. тут, у Менску. Абрамоўскі жыў разам з бацькамі.

На **хэмфармзаводзе** — член партыі **Варакса** ўвесь час угойвала аб контррэвалюцыйнай дзейнасьці свайго мужа, высланага ў 1928 г., з якім трымае сувязь да гэтага часу.

ВЫКЛЮЧНУЮ УВАГУ—РАЗГОРТВАНЬНЮ САМАКРЫТЫКІ

ТАВАРЫЩЫ! Задача камісій па чыстцы заключаецца ня толькі ў правядзеньні пэрсанальнай чысткі членаў партыі. Іх задача побач з гэтым — выявіць агульнае становішча партыйнай арганізацыі.

Я хачу ў сувязі з гэтым спыніцца на недахопах, якія ўжо выяўлены ў сувязі з чысткай у асобных ячэйках менскай партыйнай арганізацыі. Перш за ўсё **аб становішчы самакрытыкі.** Я падкрэсьліваў, што за час чысткі мы маем некаторае ўзмацненьне разгортваньня самакрытыкі, але-ж у радзе нашых партыйных ячэек самакрытыка надзвычай слаба разгорнута, бязазубая, а мясцамі ёсьць факты яўнага заціску самакрытыкі.

У вам прыведу толькі некольки фактаў, якія характарызуюць становішча самакрытыкі ў асобных партыйных ячэйках.

Вы напэўна ведаеце з газэт гісторыю з ходам чысткі ў **ДРУКАРНІ ІМЯ СТАЛІНА.** Там у першыя дні чысткі самакрытыка была да таго слаба разгорнута, была такая бязазубая, што гарадзкой камісіі па чыстцы неабходна было адкласьці работу ячэйковай камісіі па чыстцы на некалькі дзён з тым, каб правесьці спэцыяльны сход партыйцаў і камсамольцаў, правесьці спэцыяльную работу сярод беспартыйных рабочых і цэлы рад іншых мерапрыемстваў, каб людзі па-сапраўднаму разгарнулі бальшавіцкую самакрытыку і тым самым стварылі ў умовы для работы камісіі па чыстцы. Характэрна, што калі камісія па чыстцы пастаяла рубам пытаньне, што так працаваць нівуды ня варта, што так праводзіць чыстку нельга, кіраўнікі партыйнага калектыву, у тым ліку сакратар партыйнага калектыву і дырэктар друкарні, «абразіліся», пайшлі скардзіцца ў рэспубліканскую камісію. Гэта гаворыць аб тым, што яны зусім не зразумелі задач чысткі.

Дырэктар друкарні **БРЭНЭЙЗЭН** правёў сябе яўным заціскаўцом самакрытыкі, напрабаваўшы неадкладнага абгаварэньня на бюро партколектыву пытаньня аб выступленьні члена партыі, які на сходзе па чыстцы крытыкаваў яго, дырэктара, работу.

Сакратар партколектыву заводу «Бальшавік» тав. **ГЕЛЕР** і іншыя члены бюро абразіліся на праверком, чаму майстра цэху, дакуменціўшага павышэньне сабекошту на 10 проц., замест зьніжэньня на 5 проц., прымаў доўга і шмат крытыкаваў.

Можна прывесьці рад іншых фактаў, якія характарызуюць абмежаваны круг людзей, не разумеючых, якім чынам трэба працаваць у цяперашніх умовах, як трэба разгортваць самакрытыку, асабліва, калі пушчка ідзе аб выключна адказнай рабоце па чыстцы партыйнай арганізацыі.

У ДЗЯРЖПЛЯНЕ, ня гледзячы на буйнейшыя прарывы, налічваюць клясава-варожых элементаў, наяўнасьць апартуністычнага пляну, шмат гаворыць аб недахопах, а канкрэтных вінаватых не адказваюцца называць. Я, таварышы, быў на чыстцы ў Дзяржпляне і чуў, як там «скрытыкуюць». Гаворыць на дзіве гадзіны, выступаючы ў спрэчках, лічаць неабходным цэлыя рэфераты чытаць, гаворыць «наогул» аб недахопах, але ні адным словам не ўспамінаюць аб канкрэтных вінаватых. Бачыца адзін другога абраіць.

Рад сакратароў партыйных калектываў рабілі даклады на партыйных сходах напярэдадні чысткі сваіх партыйных ячэек. Здавалася-б зусім ясным, што трэба набудаваць даклад такім чынам, каб ускрыць перад камісіяй па чыстцы і ўсёй рабочай прамадзкасьцю недахопы, якія мелі месца ў рабоце (а ня трэба сумнявацца, што гэтыя недахопы ёсьць у кожнай ячэйцы), каб адразу з бальшавіцкай адкрытасьцю выявіць сапраўднае становішча партыйнай і гаспадарчай работы на прадпрыемстве.

А што выходзіць? Нават у такіх калектывах, якія лічацца перадавымі, і ў сэнсе высьвятленьня гаспадарчых задач, і ў сэнсе становішча партыйна-масавай работы, аднак, і ў іх сакратары, на жаль, працуюць па-старому. Даклады былі пабудаваны такім чынам, што менш за ўсё вызначалі недахопы, а галоўным чынам характарызавалі (як на ўрачыстых сходах) дасягненьні амаль за пяцігодку. Словам, па шаблёну рабілі даклады па старой шпаргалцы, абыходячы ўсе важнейшыя пытаньні сёньняшняга дня. Гэта зусім невышадкова, гэта характарызуе, што ў нас яшчэ зусім невыстарчальна разгорнута сапраўднае бальшавіцкая самакрытыка.

Я на пытаньні (разгортваньня самакрытыкі спыняюся крыху больш падрабязна таму, што гэта — адзін з важнейшых рашаючых моментаў на правядзеньні ўсёй работы па чыстцы партыі. Калі ня будзе ў нас сапраўднай разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі, якая крытыкуе не наогул, а канкрэтных людзей, ня гледзячы на асобы, мы нездольны будзем правесьці работу па чыстцы як належыць, якімі-б добрымі па сваім якасным складзе ні былі праверкомы. Гэта — адзін з важнейшых моментаў, які можа стварыць належныя ўмовы для правядзеньня чысткі нашых партыйных радоў. У гэтым сэнсе ў нас справа стаіць дрэнна, мясцамі нават надзвычай дрэнна. Партыйным калектывам і гаркому трэба зьвярнуць выключную ўвагу ў працэсе падрыхтоўкі партыйных і беспартыйных мас да чысткі партыі на разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі, рашуча перасякаючы ўсякае супраціўленьне гэтаму і асабліва моцна ўдараючы па фактах заціску самакрытыкі.

Другі момант, які характарызуе недахопы і паасобныя нездаровыя зьявішчы нашых партыйных ячэек, гэта — **НАЯЎНАСЬЦЬ ЭЛЕМЭНТАЎ СЯМЕЙНАСЬЦІ, КРУГАВОЙ ПАРУКІ І ГРУПАЎШЧЫНЫ.** Трэба сказаць, што ў радзе партыйных калектываў элементы сямейнасьці, круговой парукі і групаўшчыны зьявілі сабе даволі моцнае месца. Мы маем такія калектывы (электрастанцыя, першая саз. больніца), дзе гэта з'ява выявілася ў часе чысткі, дзе імена з-за адсутнасьці самакрытыкі, наяўнасьці элементаў сямейнасьці і круговой парукі (а гэта зьвязана адно з другім) цэлы рад нездаровых зьяў у паасобных партыйцаў, аб якіх гаворыць па кутках на прадпрыемствах і ў іншых месцах, ня ўскрываюцца на бальшавіцку.

Нашы камісіі па чыстцы, шукаючыся на такія зьявы, пазнаны былі ўжыць цэлы рад мерапрыемстваў, зьвязаных з ускрыцьцём гэтых нездаровых зьяў. Гэта бязумоўна ўскладняла работу па чыстцы. Гэта зьяўляецца нарывам на партыйным целе, нездаровай зьявай, якая ні ў якім выпадку не павінна мець месца ў нашых партыйных ячэйках. Мы павінны мабілізаваць нашы партыйныя калектывы (а гэта асабліва адносіцца да менскай партыйнай арганізацыі) на рашучую барацьбу з рашткамі сямейнасьці, групаўшчыны, круговой парукі, якія зьяўляюцца антыпартыйнымі з'явамі, а яўмі трэба пакончыць самым рашучым чынам і ў самы кароткі тэрмін.

РАШУЧА ВЫКРЫВАЦЬ І ВЫКІДВАЦЬ З РАДОЎ ПАРТЫІ ДВУРУШНІКАЎ, ПЕРАРАДЖЭНЦАЎ

У працэсе чысткі выяўлена, што цэлы рад ячэек **ЗАСЬМЕЧАН САЦЫЯЛЬНА-ЧУЖЫМІ ЭЛЕМЭНТАМІ, ВЫХАДЦАМІ З ДРОБНА-БУРЖУАЗНЫХ ПАРТЫЙ (БУНД І ІНШ.), БЫЛЫМІ ТРАЦКІСТАМІ, ЯКІЯ НЕ ПАРВАЛІ З СВАІМ МІНУЛЫМ.** Да гэтых элементаў у радзе партыйных ячэек былі праяўлены небальшавіцкія адносіны, усьпяленьне партыйнай пільнасьці, страта клясавай чуласьці. Да мноўіх з гэтых элементаў, якія ня толькі ў мінулым, але і ў сучасны момант зьяўляюцца антыпартыйнымі, якім ні ў якой меры ня месца ў радах партыі, рад партыйных ячэек праявілі яўна прымірэнчыя адносіны.

Вось некалькі фактаў.

На фабрыцы «Кастрычнік» — **Конік**, аб якім пісалася ў газэце. З 1904 па 1907 г. прымаў удзел у меншавіцкай арганізацыі, з 1912 — 1921 г. — актыўны член Бунду. У 1929 г. праверкомам быў выключан за ідэалізацыю бунду (потым адноўлен). Ячэйка Коніку да моманту чысткі дае наступную характарыстыку: «Конік у часе работы выявіў тое, як ударнік, спатканьняў ня меў, быў у партыі Бунду». На чыстцы-ж зьявілася, што ў Бундзе Конік быў актывістам, а зараз у ячэйцы ён ня мае ніякай партыйнай нагрузкі, што ў ім моцна сядзіць бундаўская ідэалёгія. Конік прабаваў даказаць, што «левае» крыло Бунду было зваротна з бальшавікамі, пасылала сваіх членаў на фронт і г. д. У другіх выступленьнях на фабрыцы ідэалізацыі бунду дашла да таго, што амаль і Фрунзе быў бундаўцам.

Вось, да якой ступені даходзіць ідэалізацыя бунду ў асобных людзей, якія, будучы доўгі час у партыі, усё-ж застаюцца не бальшавікамі, а бундаўцамі, элементамі дробна-буржуазнымі, якім ня месца ў радах нашай партыі. Аднак, асобныя партыйныя ячэйкі такіх людзей не правяраюць на канкрэтнай бальшавіцкай справе, не выяўляюць іх сапраўднага партыйнага нутра і таму яны маюць магчымасьць заставацца самым спакойным чынам як абываталі ў радах нашай партыі з партыйнымі білетамі ў кішэні.

Або возьмем **Роззнбэрга** — майстра цэху на заводзе «Камунар», члена гарсавету і члена ЦВК БССР. Ячэйка дала яму наступную характарыстыку: «Розэнбэрг быў пастаўлен на паўторную чыстку, дзе прыпёрты фактамі ён ужо ня змог адмаўляць сваё прабываньне ў бундзе і ўжо на гэты раз заняўся ідэалізацыяй бунду і г. д.

Бачыце, як ня вывучыўшы чалавека, ня ведаючы яго, не праверыўшы яго мінулага, партыйная ячэйка выдае яму добры атэстат — напярэдадні чысткі, як дакумэнт, які павінен быў легчы ў аснову яго пэрсанальнай чысткі.

Я-бы мог вам прывесьці яшчэ цэлы рад фактаў, якія характарызуюць прабываньне ў радах нашай партыі выхадцаў з іншых партый, да гэтага часу далёка ня зжыўшых сваё мінулае, людзей, якія адкрыта актыўна змагаліся супроць партыі, а зараз прытаіўшыся паціханьку далей робяць тую-ж контррэвалюцыйную справу, і да якіх нашы партыйныя ячэйкі праяўляюць не бальшавіцкія, ня крытычныя адносіны.

Некалькі фактаў у адносінах былых трацкістаў.

ГУТЭРМАН на тэй-жа фабрыцы «Кастрычнік», удзельнік трацкісцкай справы ў БАН, за што атрымаў суровую вымову, у мінулым матар'яльна падтрымліваў трацкістаў, за што ў 1929 годзе атрымаў вымову (аб гэтым на чыстцы ён «забыў» сказаць). На пытаньні праверкому не даваў простых адказаў, не выкрываў сваёй традэсцкай контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці, трымаў сябе вельмі задзёрыста, адказваючы камісіі — «калі я вам не спадабаюся, можаце рабіць, што хочаце».

ШКЛЯР на фабрыцы «Кастрычнік». Ячэйка дае яму наступную характарыстыку. «За ўвесь час работы на фабрыцы праявіў сябе добрым партыйцам». Між тым Шкляр — у мінулым трацкіст. За час свайго прабываньня ў партыі праявіў сябе як няўстойлівы, хісткі элемэнт.

БУНІМОВІЧ — на заводзе «Бальшавік» праводзіў чыстку добра, а пасьля гэтага высьветлілася, што ён у мінулым трацкіст і ўтаіў гэта.

ПЕСІН на тым-жа «Бальшавіку», былы трацкіст, свае памылкі не раскрытыкаваў, выкручваўся ад проведзага адказу.

КІСЕЛЬ на заводзе імя Молатава. Замест рашучага асуджэньня свайго падтрыманьня трацкіста Шапашнікава (арганізатара трацкісцкай групы БАН, выключанага з партыі) зьявіў сваю ролю да асабістай сувязі з Шапашнікавым.

СТРУГАЧ на тым-жа заводзе пры ўступленьні ў партыю ўтаіў, што будучы камсамольцам быў трацкістам.

Усе вышэйпаказаныя факты засьмечанасьці асобных ячэек антыпартыйнымі элемэнтамі гаворяць аб тым, як у гэтых партыйных прыгушілася клясавая чуласьць, партыйная пільнасьць.

Побач з гэтым, трэба адзначыць, што ў радзе ячэек засьмечаны і склад кіруючага актыву. У друкарні імя Сталіна сакратар партколектыву — сын гандляра, старшыня фабкому — сын буйнага гандляра. На фабрыцы «Камунарка» старшыня фабкому Фрыдлянд — сын ліпэнца, былы сакратар партколектыву — Капелевіч — былы сіяніст. У складзе бюро на фабрыцы было ўсяго 2 рабочых. Засьмечанасьць таксама была ў актыве на Эльводзе і на іншых прадпрыемствах і ўстановах.

Гэта гаворыць аб тым, што мы часам станем на кіруючую партыйную работу людзей неправерэных (а ў некаторых выпадках нават сацыяльна-чужых), ня меючых адпаведнай бальшавіцкай загартоўкі, людзей, якія нездольны пабальшавіцку разгортваць работу, нездольны весьці за сабой масы і выхаваць у бальшавіцкім духу нашы партыйныя арганізацыі.

Гэтыя факты гаворяць аб тым, што гарком не заўсёды ведае людзей, пастаўленых на кіруючую партыйную работу і, што ў сувязі з гэтым трэба неадкладна праверыць наш пізавы партыйны актыў, с пункту гледжаньня іх бальшавіцкай вытрымаванасьці і адпаведнасьці задачам, якія стаяць перад імі.

МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАЕ ВЫХАВАНЬНЕ—НА УЗРОВЕНЬ ЗАДАЧ ПАРТЫІ

Рад фактаў характарызуе надзвычай нізкі палітычны ўзровень партыйнаў асобных ячэек. Мы маем ячэйкі, дзе на 40 проц. члены партыі вельмі дрэнна разьбіраюцца, правільней, зусім не разьбіраюцца ў элемэнтарнейшых пытаньнях палітыкі партыі і не ахоплены сеткай партасьветы. Выяўлена такая катэгорыя людзей, якія зьяўляюцца балястам для нашай партыі, палітычна абсалютна няпісьменныя, якія зусім ня цікавяцца партыйным жыцьцём і партыйнай работай і, ясная справа, не хваробуць душой за партыю, за партыйную справу. Часам справа даходзіць проста да кур'ёзаў.

РУМАН — кандыдат партыі — на пытаньне, калі была «Кастрычніцкая рэвалюцыя», адказаў: «не памятаю — у 1917 або ў 1918 г.»; **МЭДНІК**, кандыдат партыі, на пытаньне, хто сакратар ЦК УсеКП(б), адказаў — ня ведаю».

ШТЭЙМО, кандыдат партыі з 1931 г., маючы сярэднюю асьвету, на пытаньне, што такое кляса, адказаў: «ня ведаю». Магчыма, што гэта пытаньне больш цяжкае, але чалавек з сярэдняй асьветай абавязан адказаць на такое пытаньне.

ДОРДЗІК, член партыі з 1928 г., скончыўшы 2-хгадовыя курсы па прафруху, на пытаньне, чым адрозьніваюцца прафсаюзы ў нас ад прафэсыянальных саюзаў у капіталістычных краінах і для чаго мы змагаемся з ураўніваўкай, адказаў: «я займаўся толькі па спэцыяльнасьці як культработнік і адказаць на гэта не магу»...

МАРДУХОВІЧ — намесьнік старшыні фабкому (платны работнік) таксама на пытаньне: «Якая розьніца паміж прафсаюзамі ў СССР і капіталістычнымі», адказвае: «ня ведаю».

ГРЫГОР'ЕЎ, кандыдат партыі (на заводзе «Камунар») растлумачвае, што бальшавікі і камуністы — гэта не адна і тая-ж партыя.

Чаму на гэтай самай фабрыцы «Кастрычнік» і на іншых прадпрыемствах мае месца такі нізкі культурны і палітычны ўзровень членаў партыі? Тут мы павінны ўскрыць перад самі малочнікамі, які характарызуе у некаторых ячэйках зусім недапушчальны метад вярбоўкі членаў партыі. Нашы праверкомы ўстанаўляюць, што значная група тых людзей, якія зьяўляюцца балястам, якія ня ў стане адказаць на самыя простыя пытаньні, на якія здавалася-б кожны беспартыйны ў стане адказаць, што гэтыя людзі ў асобных выпадках вербаваліся амаль што не на разьверстцы кожнай цэх'ячэйкі, а ў некаторых выпадках без асабліва іх жаданьня запісвалі, а потым на ўрачыстых сходах зацьвярджалі і прымалі.

У асобных калектывах выяўляецца зусім нясур'ёзныя, непартыйныя адносіны пры правядзеньні адказнейшай работы па вярбоўцы членаў партыі, з-за чаго ў партыю трапілі людзі, якія нават ня бывалі на партыйных сходах, не плацілі членскіх узносаў, ня ці чылі нават самі сябе членамі і кандыдатамі партыі. Калі прыняць пад увагу зусім нездавальняючую пастаноўку партмасавай, выхаваўчай работы з членамі партыі, асабліва з кандыдатамі партыі, будзе зусім зразумелым, чаму вялікая колькасьць камуністаў не разьбіраюцца ў праграме і ў статуце нашай партыі, ня ведаюць важнейшых пастаноў партыі, ня ведаюць элемэнтарных рэчаў, без якіх абсалютна немагчыма быць членам і кандыдатам партыі. З гэтых фактаў культпропу гаркому трэба неадкладна зрабіць вельмі сур'ёзны вывад.

***

Вось у асноўным тыя асобныя заўвагі, асобныя факты, выяўленыя ў працэсе работы нашых камісій па чыстцы. Я зьвяртаю ўвагу на гэтыя асабліва-сьці, на гэтыя хваравітыя зьявы, на гэтыя недахопы, бо, паўтараю, гэта мае рашаючае значэньне пры правядзеньні нашай далейшай работы па чыстцы партыйных радоў.

Мы праверылі толькі 12 проц., значыцца — 88 проц. партыйных арганізацый нам яшчэ трэба праверыць. Я не сумняваюся, што хваравітыя зьявы, якія мяюць месца ў тых ячэйках, якія мы праверылі ўжо, маюць месца і ў іншых ячэйках, у якіх яшчэ будзе чыстка. Гэта трэба бязумоўна ўлічыць. Трэба з усёй сур'ёзнасьцю ўлічыць усе асаблівасьці, якія ёсьць у радах КП(б)Б і асабліва ў радах менскай арганізацыі. Гэтыя асаблівасьці зьвязаны з наяўнасьцю элемэнтаў гнілога лібэралізму, кулацка-буржуазнага нацыяналізму, наяўнасьцю людзей, якія прыкрываюцца фальшывы - нацыянальным сьцягам, наяўнасьцю вялікай колькасьці выхадцаў з іншых партый (Бунд і інш.); наяўнасьцю элемэнтаў групаўшчыны, сямейнасьці, круговой парукі. Усе гэтыя элементы павінны быць самым рашучым чынам ускрыты і выкаранены. Мы зараз прыступаем да чысткі ячэек **САВЕЦКІХ І ВУЗАЎСКІХ**, дзе гэтыя хваравітыя зьявы маюць асабліва вялікае месца. Мы ведаем, што мела месца ў Наркамземе, дзе працавалі партыйцы, што мела месца ў Дзяржпляне, дзе таксама працуюць члены партыі, ведаем, што робіцца ў цэлым радзе гаспадарчых, каапэратыўных і іншых савецкіх ячэйках, якія часта праяўляюць прытупленьне, а ў некаторых мясцох ізалуюцца клясавай пільнасьці. Гэта — найбольш складная група ячэек. Чыстка можа быць пасьпяхова праведзена толькі пры ўмове сапраўды бальшавіцкай, сапраўднай, а не бязазубай самакрытыкі.

Усе недахопы, якія могуць быць выяўлены ў працэсе падрыхтоўкі да чысткі, павінны быць самым рашучым чынам зжыты. А гэтых недахопаў безьліч. Узяць хоць-бы такога роду элемэнтарныя рэчы, як добрая падрыхтоўка партыйных сходаў і забесьпячэньне ўдзелу беспартыйных у гэтых сходах. У гэтым напрамку ёсьць цэлы рад недахопаў, якія прыводзілі да таго, што мы мелі рад выпадкаў зрыву сходаў з-за няўкі як партыйцаў, так і беспартыйных (куставы сход чыгуначнага вузла, МЦРК, Белпэдтэхнікум). Часам праверачным камісіям прыходзіцца прымаць такога роду меры, як прыпыненьне работы, каб «накачаць» партыйныя арганізацыі. Такога роду факты зусім недапушчальны.

Гарком у першыя дні чысткі вынес рад спагнаньняў за зрыў сходу на чыгуначным вузле (сакратару партколектыву цяпі была абвешчана суровая вымова, сакратару партколектыву заводу імя Мясьнікова — вымова, загадчык клюбу быў выключан з партыі). Як відаць з наступных фактаў, гэта папярэджаньне аказалася невыстарчальным для некаторых калектываў і, як відаць, гаркому прыдзецца ў будучым прыняць яшчэ больш жорсткія меры для таго, каб у нас ня было ні аднаго факту зрыву сходу з-за дрэннай падрыхтоўкі да сходу. Добрая арганізацыя сходу (памяшканьне, забесьпячэньне яўкі партыйцаў, камсамольцаў і беспартыйных, стварэньне ўмоў для найбольш нармальнай работы камісіі па чыстцы) зьвяўляецца ня тэхнічнай справай, а за гэта пэрсанальна адказваюць трыкутнік і сакратар партколектыву ў першую чаргу.

Партыйны актыў, асабліва тых партыйных ячэек, дзе чыстка яшчэ не пачата, абавязан недахопы, якія выяўлены з першых дзён чысткі, улічыць з тым, каб іх своячасова папрадзіць у сябе ў ячэйках.

ЛЕПШАЯ ПАРТЫЙНАЯ ШКОЛА

Мы маем выключна добрыя адносіны да чысткі з боку партыйных і беспартыйных мас. Мы павінны толькі гэта добра выкарыстаць і замацаваць. Я магу прывесьці факты таго, дзе чыстка праводзілася больш ці менш добра, добра былі падрыхтаваны партыйныя і беспартыйныя масы і гэта дало свае рэзультаты.

Я прыступіў на сходзе па падвядзеньні вынікаў па чыстцы на электрастанцыі. Калі я задаў пытаньне прысутным, якія, па іх думцы, ёсьць недахопы ў рабоце камісіі і як, па іх думцы, прайшла чыстка, дык рабочыя, якія ўвесь час прымалі ўдзел у чыстцы (чыстка цягнулася каля двух тыдняў), заявілі, што **МЫ НІКОЛІ ЯШЧЭ НЯ МЕЛІ ТАКОЙ ШКОЛЫ, ЯК У ЧАСЕ РАБОТЫ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ.** Там-жа на заводзе ў пачатку чысткі беспартыйны рабочы, выступаючы заявіў: «З самага пачатку Кастрычніцкай рэвалюцыі я не выступаў, а зараз бачу, што трэба выступаць, трэба дапамагчы партыі ачысьціць свае рады».

Ня дрэнна арганізаван удзел беспартыйных рабочых на заводзе «Камунар», прычым асаблівай увагі заслугоўвае зварот беспартыйных кадравых рабочых да рэспубліканскай і гарадзкой камісіі па чыстцы (апублікован у газэтах) з канкрэтнымі абавязацельствамі па перавыкананьні свайго прамфінпляну, якія яны бяруць на сябе ў сувязі з правядзімай чысткай.

Вось, бачыце, як на Эльводзе, на «Камунары» і ў некаторых іншых мясцох пры адпаведнай увазе адолелі зацікавіць чысткай як партыйных, так і беспартыйных. Гэта залежыць на толькі ад уменага падыходу камісіі па чыстцы, але залежыць у значнай меры ад партыйных ячэек, у першую чаргу, ад кіраўнікоў з пункту гледжаньня падрыхтоўкі імі партыйных і беспартыйных мас да ўдзелу ў чыстцы.

***

ТАВАРЫШЫ, я зусім не закрануў пытаньняў, зьвяз

Ператварыць рыбгасы у магутную крыніцу рабочага снабжэньня

ПРЫТУЛАК БРАКАНЬЕРАЎ І ЗЛОДЗЕЯЎ

Адным з самых вялікіх вазёр у БССР зьяўляецца «Чырвонае Палесьсе»—былое «Князь-возера». Даўжыня яго 18 клм., шырыня 7-8. Знаходзіцца яно ў Лахавіцкім сельсавеце, ля вёскі Пухавічы, у глушы Палесьля.

Возера гэта зьяўляецца магутнай крыніцай рыбалоўства і адыгрывае вялізарную ролю ў рабочым снабжэньні.

Тры калгасныя рыбацкія брыгады па 12 чалавек кожная і адна арцель аднасобнікаў у 18 чалавек абслугоўваюць гэты вялікі водны прастор.

Мазырскае аддзяленьне Белрыбы павінна было прыняць усе меры, каб наладзіць арганізаванае кіраўніцтва работай рыбацкіх брыгад. Аднак на справе ніякага кіраўніцтва імі няма. **Поўны непрыгадак, бескантрольнасьць, безгаспадарчасьць пануюць на лове.** Партыйныя і савецкія арганізацыі Жыткавіцкага раёну і Лахавіцкага сельсавету ніякай увагі не аддаюць яму вучастку работы.

Лепшы ўдарнік Валмянскага рыбгасу тав. ФІНСКІ.

Вось канкрэтныя факты працы паасобных рыбацкіх брыгад і арцелей. У 1932 г. брыгада калгасу імя Сталіна выкапала ня больш 50 проц. заданьня (плян 1800 цэнтн. выгаўлена 953). На лепшыя вынікі даў вясенні лоў гэтага году. Зрыў выкананьня пляну тлумачыцца выключна тым, што палова рыбакоў сыстэматычна ня выходзіла на працу. Напрыклад, у 1932 г. брыгада працавала толькі 151 рабочы дзень, замест 4-5. У гэтым годзе да паловы мая было адпрацавана толькі 79 рабочых дзён. У брыгадзе няма ніякай працоўнай дысцыпліны, яна не атрымлівае канкрэтных заданьняў на дзень, пяцідзёнку або дэкаду.

Старыя працэдэнты звычай і мэтады пануюць на лове. Характэрная заява рыбавода брыгады **Яжі Макарэвіча:** «Цяпнем, стараемся, колькі наловім за дзень рыбы—і тое добра». А другія члены брыгады дадаюць: «Рыбацкая справа—цёмная, ніхто ня ведае, колькі калі можна злавіць, так што ад нас нічога не залежыць».

Аб новых мэтадах работы, аб новых зьявах і гаварыць ня прыходзіцца. Ніякага сацспаборніцтва! Ніякай растлумачальнай і мабілізуючай работы у брыгадзе! Брыгада ні перад кім не рабіла справаздачы, ніхто яе не кантралюе. Часамі прыбудзе паперка, часамі прыедзе «гастралёр» з Белрыбы.

Такія-ж парадкі пануюць і ў брыгадах калгасу «Чырвоны бераг», «Беларускі Камунар», якіх горш стаіць справа ў арцелі аднаасобнікаў.

Рыбацкія брыгады і арцелі пляну ня выконваюць, а крадзёж рыбы прыняў масавыя разьмеры. Вось некалькі фактаў. Як правіла, калі брыгады вяртаюцца з лову, ля берагу іх чакае каля 50 сялян, кожны з торбай, кожны «дапамагае» пацяпнуць човен, кожны набірае патроху рыбы, прычым ніхто з рыбакоў гэтаму не перашкоджае.

Апрача таго, на лове ўкаранілася такая традыцыя, што кожны рыбак бярэ сабе некалькі кілёграм рыбы—ён выбірае яшчэ на возеры самую буйную рыбу. Рыбакі гаворацьь, што, паводле дагавору, яны павінны адрымліваць пэўную колькасьць прадукцыі, але факт застаецца фактам—кожны бярэ сабе ў два-тры разы больш, чым прадугледжана дагаворам.

Шырока разьвілося і **браканьерства.** Амаль кожную ноч па возеры зьяўляюцца чаўны браканьеры з пераматамі, сеткамі вылоўліваюць шмат рыбы, а возера ніхто не ахоўвае, ніхто ня цікавіцца захаваньнем вялізарных багацьцяў. Калі адпойчы некалькі рыбакоў з брыгады калгасу імя Сталіна паехалі на аблаву тых, якія незаконна ловяць рыбу, дык толькі ў адным канцы возера забралі 15 сетей. Больш такіх аблаў ніхто не рабіў.

Сакратар парт'ячэйкі т. **Купрацэвіч** проста, не саромячыся, заяўляе: «Я кажу, што рыбу ловяць па начох, бываю часамі на сходах арцелей, але я не ўваходзіў у сутнасьць справы». Старшыня сельсавету тав. **Ярмош** нас гуд пытаньнямі рыбнага лову не займаецца.

С. П.

Фабрыка карпа на Волме

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Густыя лясы... Бясконцыя балоты... Запітыя водой сенажаці... Неабсьпечныя, абмаданныя балоты, якія песьцяць эрок сьвежай зеляніны. Нізкая даліна, па якой шырока разьлілася Волма.

У гэты край, на берагі Волмы тры гады назад прышлі людзі з сякерамі, матыкамі і лапатамі. Закіпела работа. Адна за другой падалі векавечныя волаты-сосны, расчышчаліся вучасткі, выкаповаліся магутныя карчы, будаваліся дамбы, запруды і шлюзы.

Волей партыі ў 25 вярстах ад г. Чэрвеня, у раёне вёсак Петравінкі і Кліпок узьнікла буйная рыбаводчая гаспадарка.

«У нас людзі самі рыбу робяць»—ганарацца сваім рыбгасам вакопічныя сяляне.

Удалае месца выбрана для пабудовы... Нізінныя балоты якія лёгка абвадняюцца і асушаюцца. Выстарчальная колькасьць вады вышэйшай якасьці. Добра ўраджайная глеба. Нарэшце блізасьць да новапабудованай шашы, —толькі 4 клм.

Складаная сыстэмай пабудоў зьяўляецца рыбная гаспадарка. Дзесяткі прудоў—малых, заросшых травой нераставікоў, вялікіх вырасных нагульных, зімавольнікаў. Раскінуліся яны на прасторы 600 га. Іх апераезалі бясконцай істужкай канаў—паміж імі штучныя насыпі—дамбы, што цягнуцца на цэлыя кілёмэтры. Уявеце сабе цікавейшую асушальную сетку—розныя прыпады—«маналі», «паткі» (шлюзы) для спуску вады і налаўненьня прудоў, трэблі і інш.

Адных толькі нераставых прудоў налічваецца ў гаспадарцы звыш 80.

Гэта сапраўдная абсталяваная паводле апошняга слова тэхнікі фабрыка рыбы. Для разьвядзеньня выбран зэркальны карп «вадзяная сьвіньня» як называюць яго немцы.

Карп—рыба вельмі плодавітая, хутка расьце, непераборлівая ў кармох, выно сьпіваю, рыба, якая дапускае розныя апэрацыі, у сэнсе выпоўліваньня і перасадак. Адна самка карпа дае да 70—80 тыс. інрынак у год. Да гэтага трэба дадаць, што мяса карпа вельмі смачнае і тлустае.

Усё гэта досыць выразна адказвае на пытаньне, чаму Валмянскі рыбгас выбраў зэркальнага карпа.

У кароткіх рысах покажам працэс вытворчасьці. У канцы мая карп у нераставых прудох спускае ікру. Праз некалькі дзён выходзяць малькі вялічынёй у маленькую шпілечку—яны 2.3 тыдні знаходзяцца ў прудох. Пасьля гэтага іх пересаджваюць у вырасныя вадаёмы. Там яны растуць, разьвіваюцца да глыбокай восені. Восеньню сяголетак (дробную рыбу) перавозяць у зімавальнікі. Пасьля зімоўкі, вясной іх перасаджваюць у нагульныя пруды, дзе рыба набывае вагу і тлушч.

Да восені яна ўжо важыць 800 і больш грам.

Такава складаная сыстэма выхаваньня і разьвядзеньня карпа.

Рыбгас, як і ўсякае вытворчае прадпрыемства, мае свой праф'ініплян: колькі малькоў і сяголетак трэба атрымаць

Інжынэр-рыбавод Валмянскага выбгасу тав. ЗАХАРЭВІЧ

на працягу году, колькі таварнай рыбы трэба даць дзяржаве. У мінулым годзе рыбгас выканаў плян нераету і вырошчваньня малька на 101 проц. Высаджана сёлета на нагул каля 200 тыс. шт. рыбы. У канцы гэтага году гаспадарка дасьць каля тысячы цэнтнэраў таварнай прадукцыі. Дзякуючы блізасьці добрай шашы, Менску будзе адгружана жывая рыба.

У гэтым годзе вытворчае заданьне рыбгасу—атрымаць 1.320 тыс. малькоў. Гаспадарка высунула свой сустрэчны плян—даць 1,5 млн. Плян зусім рэальны, ёсьць усе магчымасьці для яго ажыцьцяўленьня. Перавыканаўшы плян зімоўкі гаспадарка нават прадала некалькі сот тысяч сяголетак Маскоўскай вобласьці і двум рыбгасам БССР.

У будучым годзе на рынак павінна быць выкінута 2.000 цэнт. рыбы. Ёсьць усе падставы для таго, каб павялічыць гэту лічбу амаль у два разы, пры ўмове інтэнсыўнага аддаленьня гаспадаркі. Дырэктар рыбгасу тав. ЯБЛЫКАЎ і тахнічны кіраўнік інж. ЗАХАРЭВІЧ запэўнілі т. т. Мікяна і Галадзеда, нядаўна наведаўшых гаспадарку, што яны абавязваюцца поўнасьцю скарыстаць усе вытворчыя магчымасьці і давесьці прадукцыю да максымальных разьмераў.

А вытворчыя магчымасьці гаспадаркі—сапраўды вялікія. Нельга забываць, што будаўніцтва ў разгары, што плян яго выкананы толькі на 60-70 проц. У вёсцы Кліпок яшчэ ня скончана пабудова раду прудоў. Фабрыка карпа на Волме яшчэ не працуе на поўную экспляатацыйную магутнасьць.

Вялікай увагі заслугоўвае фэрма па гадоўлі качак пры рыбгасе. Восеи інкубатараў вырошчваюць качак палепшанай пароды. Добры догляд інкубатараў забясьпечвае высокі выхад прадукцыі—да 70 проц. (у Жлобінскай гаспадарцы—22 проц.).

Валмянская качка—гэта мэтыю простай птушкі з «пэкінам» і «індыйскім бягуном». Палепшаная парода дае больш мяса і большую яйцаноснасьць. 35 яек у год дае простая качка, 60 дае мэтыю.

У «бродзягаўзе» фэрмы каля 3 тысяч качак, пачынаючы ад зусім малосянькіх і канчаючы вялікімі птушкамі. Да канца году іх будзе 5 тысяч. Хутка рабочыя цэнтры атрымаюць сьвежае смачнае мяса вытворчасьці Валмянскай фэрмы.

Узьнікае пытаньне: навошта рыбгасу дапаможная фэрма, ці акупляе яна клопаты і выдаткі па экспляатацыі? АКУПЛЯЕ ПОЎНАСЬЦЮ. Нельга забываць, што ў тых-жа прудох кочкі знаходзяць натуральныя кармы. Помёт іх служыць вялікім добрым угнаеньнем для прудоў (правільнае аддзяленьне рыбнай гаспадаркі патрабуе сыстэматычнага ўгнаеньня вады). Як на палёх багаты ўраджай можа быць атрыман пры добрым угнаеньні глебы, так і на фабрыцы рыбы высокая прадукцыйнасьць можа быць здабыта шляхам угнаеньня прудоў.

Як мы ўжо адзначалі, будаўніцтва рыбгасу далёка яшчэ ня скончана. Адна з прычын—НЕДАХВАТ РАБОЧАЙ СІЛЫ. Працуюць галаўным чынам прыезджыя сэзоньнікі з Украіны—іх 230 чалавек. Павінна быць каля тысячы. Трэба ўзяць цьвёрды курс на вярбоўку мясцовай рабочай сілы. Вось тут якраз кіраўнікі рыбгасу натыкаюцца на сьцяну інэртнасьці і пасыўнасьці сельсаветаў і парт'ячэек на мясцох.

Старшыня ВАЛЬВАЧОЎСКАГА сельсавету АНТАСЮК шкодзе вярбоўку рабочай сілы для рыбгасу, ён ня выконвае адпаведных дырэктыў райкому. Сакратар Кліпоцкай ячэйкі БАЙБІКАЎ сам зьяўляецца вярбоўшчыкам леспрамгасу і перманьвае рабочых. У Кліпку на будаўніцтве прудоў занят 150 чалавек працуе ў большай частцы 20 — 40 ч. Пятровінскі вучастак на даў ні аднэй фурманкі.

Чэрвеньскі РК і РВК павінны прыняць усе меры, каб забясьпечыць рабочай сілай Валмянскую рыбную гаспадарку.

Пралетарская грамадзянасьць павінна ведаць лепшых ударнікаў Валмянскай фабрыкі карпа.

Інжынэр-рыбавод тав. ЗАХАРЭВІЧ усю сваю энэргію і веды аддае гаспадарцы. Апрача кіраўніцтва экспляатацыяй, ён займаецца навуковымі досьледамі. Вывучае магчымасьці зімоўкі рыбы ў вырасных прудох. Рабіць вопыты па ачышчэньні прудоў ад шкодніка малька. Ён ужывае спэцыяльныя краткі, каб не дапусьціць у вадаёмы дзікай рыбы. Упяршыню ў Саюзе ў Волме быў пабудован вапнавы млын для палепшэньня якасьці вады.

З пачатку будаўніцтва працуе ў гаспадарцы лепшы ўдарнік, старшы рабочы тав. ЧАКАТОЎСКІ. Стары рабочы тав. ПРАХОРЧЫК уніж рэд рацыяналізатарскіх прапаноў і, лепшы ўдарнік, выпучан гідратэхнікам.

Узорную работу на будаўніцтве паказваюць гідратэхнік ФІНСКІ і стары рыбак тав. КАСТУСЬ ПРЫЛУЦКІ.

Валмянская фабрыка разьвіваецца і расьце. Яе работа паказвае, што няма такіх крэпасьцей, якіх не моглі-б перамагчы бальшавікі, што мы навучыліся ў самых цяжкіх умовах стварацьь самыя складаныя, тэхнічна-ўдасконаленыя прадпрыемствы.

БУТОМАЎ.

в. Петравінка, Чэрвеньскага раёну.

ЗАГІНУЛІ СОТНІ ЦЭНТНЭРАЎ КАШТОЎНАЙ РЫБЫ

23 гады назад два жыткавіцкія памешчыкі Левандоўскі і Курачыцкі заняліся разьвядзеньнем рыбы. Яны марылі аб вялікіх прыбытках. Ім удалося засяліць рыбай пруды плошчай у 300 га.

У часе вайны і белапольскай акупацыі гэта гаспадарка была зруйнавана, рыба зьнішчана, шлюзы спалены. У 1925 г. НКЗ пачаў капітальны рамонт гаспадаркі і аднаго-сова пашырыў яе. Калі 500 тыс. руб. укладзена ў будаўніцтва.

Зараз рыбная гаспадарка «Чырвоная зорка», Жыткавіцкага раёну, займае плошчу ў 960 га.

Аб разьмерах гаспадаркі досыць ясна таварыць наступныя лічбы. Плошча адных толькі нагульных прудоў перавышае 800 гектараў. Вада ў пруды падаецца з возера «Чырвонае Палесьсе» праз канал у 18 клм. даўжыні.

«Чырвоная зорка» мае ўсе магчымасьці даць высакаякасную таварную прадукцыю і паставіць рыбную гаспадарку на ўзорную вышыню.

Аднак, поўная бескгаспадарчасьць, адсутнасьць адміністрацыйна-тэхнічнага кіраўніцтва, ігнараваньне інтарэсаў гаспадаркі з боку жыткавіцкіх раённых арганізацый і Белрыбы прывялі рыбгас да развалу. З году ў год зьмяншалася колькасьць таварнай прадукцыі.

Даволі адзначыць, што калі ў 1929 г. было здадзена 56 цэнтн. таварнай прадукцыі, дык у 1932 г.—15 цэнт. (мы не гаворым аб улове дзікай рыбы). У 1932 годзе разьвядзеная рыба загінула ад злачынай неахайнасьці адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу. Трэба было атрымаць ад нерасту 800 тыс. малькоў. Калі лічыць максымальны адыход у 35 проц., дык трэба было перасадзіць у вырасныя пруды 520 тыс. шт. Рабочы калектыў прыняў сустрэчны плян—даць для пасадкі 650 тыс. шт. Што-ж атрымалася на справе? Перасаджана было 400 тысяч малькоў, а пасьля аблову, пры перамяшчэньні рыбы ў зімавальнікі атрымалася толькі... 323 тыс. шт. Страты перавышаюць 20 тыс. руб.

Чаму-ж загінула рыба? Малькоў спускалі ў неачышчаныя каналы, у брудныя пруды, з розным сьвежацькі, ёркой, тэмпэратура вады не вымяралася. Пры перасадцы малькоў і нагнаў пеньні прудоў вадой прапускалі шмат дзікай драпежніцкай рыбы, якая пад'ядала малькоў. Пры аблове прудоў, напрыклад, вылаўлена 40 цэнт. шчукі—зьлейшага ворага малькоў.

У гаспадарцы работа фармальна была перабудавана—працавалі брыгады, рабочыя былі прымацаваны да поўных вучасткаў. Аднак, рабочыя па зьдзельшчыну не пераведзены, сацдагавары заключаны ня былі, рабочыя не спаборнічалі паміж сабой, калектыў гаспадаркі не адказаў нават на вызыкі рыбгасу «Белае». Працэсьцкі сіна была ў запаздзе: рабочыя рай-

Лепшы ўдарнік Валмянскага рыбгасу тав. ПРАХОРЧЫК

ворчых пытаньняў не абмяркоўвае. Аб палітычным узроўні членаў ячэйкі сьведчыць такі факт: на пытаньне, як ячэйка рыхтуецца да чысткі, сакратар тав. Яўсеенка адказаў: «Аб чысткі нічога не чытаў, чуў, што яна пачалася».

Трэба адзначыць, што ў гэтым годзе рыбгас дасягнуў некаторых посьпехаў. Перасаджана на нагул 198 тыс. шт. замест 175 тыс. паводле пляну. Гаспадарка ня дрэнна падрыхтавалася да нераставай кампаніі: яна разьлічвае атрымаць 800 тыс. малькоў. Гэты зрух трэба-замацаваць.

Галоўныя задачы—разгарнуць сацспаборніцтва сярод рабочых, ліквідаваць абяцыліну ўмацаваць працэсьцкіліну і наладзіць цьвёрдае апэрацыйнае кіраўніцтва гаспадаркай. Гэта асноўныя звены барацьбы за аздараўленьне «Чырвонай зоркі», за ліквідацыю бескгаспадарчасьці.

Н—к.

ПЛАДЫ ЗЛАЧЫННАГА ГАСПАДАРАНЬНЯ

Рыбная гаспадарка «Белае», Жыткавіцкага раёну—яшчэ да рэвалюцыі мела 500 га штучных вадаёмаў. У 1919-20 годзе гаспадарка была зруйнавана. Пры савецкай уладзе ўдалося не адпавіць і значна пашырыць.

Зараз экспляатуецца 842 га прудоў. За шэсьць год на пашырэньне рыбгасу выдаткавана больш паўмільёну рублёў.

Гаспадарка расла, але дзякуючы сучаснаму бескгаспадарчаму кіраўніцтву мы маем малы выхад прадукцыі.

Амаль кожны год па розных прычынах гінула шмат рыбы. У пачатку мінулага году загінуў увесь сяголетак. У маі гэтага году пры перасадцы рыбы з зімавальнікаў у нагульныя пруды загінула 30 тыс. шт. рыбы, чым нанесены гаспадарцы страты ў 45 тыс. руб.

Надбайна перасаджваючы рыбу, дапусьцілі забруджваньне прудоў, не пакланяцілася падаць ваду ў пруды ў час перасадкі. Поўную адказнасьць за гэта нясуць дырэктар рыбгасу тав. **Мардкевіч** і рыбавод Калюта, якія заварушыліся толькі тады, калі мёртвая рыба ўсплыла на паверхню прудоў.

Работа ў гаспадарцы ідзе кавалёкам, без кіраўніцтва з боку адміністрацыі. **Ураўнілаўка і абязьлічна пануюць амаль на ўсіх вучастках гаспадаркі.** Характэрны факт.—Кожны грабар незалежна ад таго, працаваў ён ці не, атрымлівае ўсе прадукты. Няма ніякага ўліку выхаду цягавай сілы на працу—коням грабараў, якія не працавалі, таксама выдаюцца кармы па поўнай норме. Ніхто ня сочыць за расходваньнем кармоў. У аспрэдзінча рабочых прыехала шмат кулакоў, якія па-шкодніцку адносіліся да цягавай сілы і амаль усіх коняй вывелі са строю. Некаторыя грабары за пошт коняй выкарміваралі 10-пудовых кабаноў. Аб гэтым добра ведала адміністрацыя. Прараб Тарнапольскі нават выхваляўся гэтым: «Вось як у нас добра працуюць грабары, аж-по 10 коняй на лі». Замест таго, каб аддаць шкоднікаў пад суд, іх заахвочвалі падобнымі заявамі.

Лічо адзін прыклад злачынай бескгаспадарчасьці. Штатныя работы, якія працавалі на цяжкіх работах, выраблялі ў дзень 4-5 руб. Груша-ж кулакоў, якой кіраваў рыбавод Калюта, выконвала больш лёгкія работы і атрымлівала па 10 руб. па кожнага чалавека і ўзмоцнены паёк.

Шмат рыбы раскрадвалася. **Дзьверы гаспадаркі былі шырока расчынены для злодзеяў**—прыходзь і бяры. Пруды ахоўваюцца надзвычай дрэнна: на працягу 8-10 кілёмэтраў ня знойдзеш ні аднаго вартаўніка.

Як кіравала рыбгасам Белрыба? Нельга сказаць, што прадстаўнікі Белрыбы не наведвалі «Белае». Яны прыязджалі ў гаспадарку, сутарылі з дырэктарам і, паверыўшы яму на слова, ад'яжджалі назад у Менск. Менш за ўсё цікавіліся яны сапраўдным становішчам гаспадаркі—усе злачынствы прайшлі міма іх, канкрэтнай дапамогі рыбгасу яны не аказалі.

Фармальнае, бюракратычнае кіраўніцтва, гастралёрская сыстэма наздаў, злачынная бескгаспадарчасьць пры вялі «Белае» да агіднага становішча.

Валодзін.

З. ГІНЗБУРГ

РАШУЧА ПАЛЕПШЫЦЬ КІРАЎНІЦТВА РЫБНАЙ ГАСПАДАРКАЙ

Рыба адыгрывае вялізарную ролю ў палепшэньні рабочага снабжэньня. З кожным годам павялічваецца ўдзельная вага рыбапрадуктаў у грамадзкім харчаваньні.

У БССР ёсьць вялізарныя магчымасьці для здабычы рыбы. Апрача багацейшых рачных сыстэм у нас палічваецца да 90 тыс. га вазёр.

Пры правільнай экспляатацыі паных вадаёмаў, пры належнай увазе да гэтай справы з боку мясцовых арганізацый мы можам стварыць вельмі вялікія рыбныя рэсурсы, непараўнальна большыя, чым мы зараз маем.

У нас таксама ёсьць вялізарныя перспэктывы для атрыманьня рыбы, у прыватнасьці, таварнага карпа праз разьвядзеньне яго ў прудных гаспадарках. У БССР палічваецца зараз 6 вялікіх прудных гаспадарак, з якіх тры арганізаваны за апошнія некалькі гад.

На будаўніцтва і пашырэньне гэтых рыбгасаў выдаткавана за апошнія 3 гады больш трох мільёнаў рублёў. Гэта сьведчыць аб тым, якое вялікае значэньне надае партыя і ўрад гэтай справе.

Як-жа скарыстоўваюцца гэтыя мільённыя ўкладаньні? Як экспляатуюцца нашы прудныя гаспадаркі? На гэта пытаньне даюць адказ матар'ялы, якія друкуюцца сёньня ў «Зьвязьдзе». Яны гаворацьь аб тым, што **нашы рыбныя рэсурсы, нашы прудныя гаспадаркі экспляатуюцца надзвычай дрэнна.**

У прудных гаспадарках мела месца ня толькі бескгаспадарчасьць, але проста шкоднікае вядзеньне справы. Не праводзіліся, неабходныя мерапрыемствы, якія забясьпечваюць нармальнае вырашчваньне рыбы ў розных стадыях. З-за гэтага штогодня масамі гінула рыба. Не праводзілася мэліярацыя і ачыстка прудоў, апошнія не дэзынфэкціраваліся, пры падачы вады ў пруды прапускалася драпежніцкая рыба, што прыводзіла да масавай пагібелі, а ў некаторых гаспадарках да поўнага знішчэньня рыбы. У рыбгасе «Чырвоная Зорка», Жыткавіцкага раёну, з нераставых гнёздаў у 800.000 малькоў перасаджана ў выросныя пруды 400.000, а ў зімавальнікі ўсяго толькі 23.000 шт. сяголетка. У рыбгасе «Белае» ў пачатку 1932 году так сама загінуў увесь сяголетак. У гэтай-жа гаспадарцы ў маі 1933 году нагульныя пруды пакрыліся мёртвай рыбай, і камісія навуковай рыбнай станцыі прымушана была канстатаваць, што рыба загінула ад упушчэньня ў сувязі з непыстартчальнай падачай вады ў пруды.

У рыбгасе «Сьлянка» (ля Менску) пасьля зімоўкі 1932-33 году з-за дрэннай дэзынфэкцыі прудоў загінула 87,7 проц. сяголетка, г. зн. зьнішчана амаль уся рыба.

З году ў год павялічваўся процант адыходу рыбы ў розных стадыях не вырашчваньня—у 1932 годзе гэты процант павысіўся да недапушчальных разьмераў —74 проц. па сяголетку, 88 проц. па гадавіку. У выніку такога «гаспадараньня», выключнай бескгаспадарчасьці злачынных адносін да справы з боку кіраўнікоў рыбгасаў та **варная прадукцыя ў 1932 годзе разка зьнізілася ў параўнаньні з 1930 годам.** Калі ў 1930 годзе таварная прадукцыя па карпу складала 547 цэнтн., дык у 1931 годзе — 214, 1932 г. — 179. Мы маем тут сапраўды шкодніцкае зьмяншэньне прадукцыі амаль на 65 проц.

Кадры работнікаў рыбгасаў не праверяліся, адміністрацыйна-тэхнічны персанал засьмечан чужымі, шкоднікімі элемэнтамі. У рыбгасе «Белае» рыбавод Калюта, кладаўшчык Мардкевіч, прараб Тарнапольскі сыстэматычна шкодзілі, раскрадвалі прадукты і прамтавары, вызначаныя для снабжэньня рабочых, апускалі рабочых прыпісваючы ім па ведамасьцях тавары і прадукты, якіх яны не адрымлівалі. Гэта група шкоднікаў літаралына зьнішчала рыбгас. У гэтай-жа гаспадарцы працавалі грабары па вызваны зямлі; ім выдаваліся прадукты, асабліва збожжа і фураж для коняй без усякага ўліку іх работы, у выніку—кулакі, якія пралезьлі ў гаспадарку, кармілі гэтымі прадуктамі сваіх уласных коняй, кароў, кабаноў, а цягавая сіла гаспадаркі выведзена са строю — з 22-х коняй 10 здохлі.

Арганізацыя працы ў гаспадарках пастаўлена надзвычай дрэнна, зьдзельшчына не праведзена, няма ўліку і кантролю за работай. Абязьлічка і кулацкая ўраўнілаўка пануюць у рыбных гаспадарках.

Ніякай масава-палітычнай работы сярод рабочых не праводзіцца. У рыбгасе «Чырвоная Зорка» парт'ячэйка фактычна не працавала, не рэагавала на злачынствы і шкодніцтва.

Ня лепшае становішча і ў галіне **экспляатацыі вазёрных і рачных вадаёмаў.** На вучастках Белрыбы працуюць 25 рыбацкіх арцеляў і 32 калгасныя брыгады. Плян улову імі ня выкананы. Заданьне 1932 году выкана толькі на 71,8 проц. Гадавы плян 1933 году да 21 верасьня выкананы на 39,3 проц. (па цьвёрдай здачы—на 50 проц., па калгасным гандлі на 26,3 проц.).

Самацёк, бескантрольнасьць, поўная адсутнасьць кіраўніцтва работай—вось чым характарызуецца становішча на лове. Рыбакі працуюць так, як працавалі іх бацькі і дзяды. Ніхто ня сочыць за тым, калі яны выходзяць на работу, колькі раз закідваюць нерат, як скарыстоўваюць вадаёмы. Сапраўды бяспрытульны і забыты вучастак важнейшай работы!

Мясцовыя партарганізацыі ня цікавяцца работай на лове, не ўмацоўваюць рыбацкія брыгады. Яны не зьвярнулі ніякай увагі на становішча масавай работы на лове. Няма нічога дбўнага ў тым, што тут пануюць старыя дзедаўскія звычаі і погляды: «Наша работа—цёмная справа, ад нас нічога не залежыць». Адсюль работа старымі, дабно зжытымі мэтадамі: «Колькі паловім—добра будзе». Адсутнасьць працоўнай дысцыпліны, адсутнасьць бескгаспадарчага воку, прыводзяць да масавых раскрадваньняў рыбы, да браканьерства, з якім ніякай барацьбы не вядзецца.

Экспляатацыя вадаёмаў ідзе дрэннежніцкімі спосабамі, не праводзіцца ачыстка і мэліярацыя вазёр. Некаторыя вадаёмы ператварыліся ў звалныя месцы.

Узьнікае пытаньне, чым займаўся Белрыбтрэст, як ён мог дапусьціць такую бескгаспадарчасьць, такія злачынствы?

Усе матар'ялы аб рабоце рыбных гаспадарках, аб ходзе лову сьведчаць аб адным: **Белрыбтрэст правяў поўную бездапазнасьць у адносінах да даручанай яму справы.** Гаспадаркі працавалі без кіраўніцтва. Белрыбтрэст сваімі пасыўнымі адносінамі да агідпасьцей, якія цемі месца ў рыбгасах, фактычна патураў шкоднікам і самаснабжэнцам.

Нават такія факты, як масавая пагібель карпа ня выклікала асаблівай трывогі ў кіраўнікоў Белрыбы, яны вольні спакойна адносіліся да гэтых злачынстваў. Былы дырэктар Белрыбтрэсту **Вайтышак** не прыцягнуў да адказнасьці ні аднаго з кіраўнікоў рыбных гаспадарак.

Белрыбтрэст ня цікавіўся тым, каб ачысьціць гаспадаркі ад чужых, шкодніцкіх элемэнтаў. Прыняўшы два месяцы назад кіраўніцтва рыбацкімі арцелямі і брыгадамі ад рыбкалгасбыту (Белрыбсаюзу), Белрыбтрэст пакінуў усё па-старому, не перабудаваў работы, не наладзіў правільнага апэрацыйнага кіраўніцтва ловам.

Ён дапусьціў яўна **шкоднікае пляненьне** разьвядзеньня рыбы пры прудавых гаспадарках. Ён капітальнаваў адыход сяголетка ў 50 проц. (!) Гэта лічба амаль у два разы перавышае нармальны адыход, які дапушчаецца ў практыцы рыбаразьвядзеньня. Такое пляненьне зусім дазарыентуе рыбгасы, не мабілізуе іх на барацьбу з адыходам, за павялічэньне выхаду таварнай прадукцыі, яно патурае шкоднікаму вядзеньню справы.

Яшчэ адзін факт: б. рыбаксавоз уста навіў на 1933 год значна зьменшаныя пляны лову (на 20-30 проц.) у параўнаньні з мінулым годам. Брыгадзе калгасу імя Сталіна, якая працуе на возеры «Чырвонае Палесьсе», ён даў заданьне ў разьмерах 56 проц. фактычнага вылову 1932 году.

Кіраўнікі рыбных вучасткаў Белрыбы зараз адпачываюць на лаўрах, бо гэтыя пляны можна выканаць нават пры пнерапрацыі дрэннай арганізацыі працы.

Гэтым яны патураюць рвацкім кулацкім элемэнтам з арцеляў і брыгад, фактычна дапамагаюць раскрадваньню прадукцыі, зрываюць барацьбу за павялічэньне вылову. **Такую работу нельга інакш кваліфікаваць, як шкоднікую.**

Поўную адказнасьць за гэта нясе дырэктар Белрыбы тав. **Кісьліца**, які ня здолеў рашуча перабудаваць работу трэсту.

Трэба адзначыць, што ў гэтым годзе работа рыбных гаспадарак палепшылася, адыход прадукцыі зьменшыўся, але рашаючы пералом яшчэ не дасягнут.

Што трэба зрабіць, каб палепшыць становішча на вучастку рыбаводчы?

Неабходна тэрміновае правесьці рад мер па палепшэньні кіраўніцтва рыбгасамі. Умацаваць кіруючы і тэхнічны персанал вытрыманым кадрамі. Пашырыць партыйную і камсамольскую праслойку гаспадарак шляхам перакідкі работнікаў з раённых арганізацый. **Ачысьціць рыбгасы ад кулацкіх і шкоднікіх элемэнтаў. Ліквідаваць абязьлічку ў арганізацыі працы і кулацкую ўраўнілаўку, перавёўшы рабочых на зьдзельшчыну.**

Трэба неадкладна прыняць рад мер па палепшэньні грамадзкага харчаваньня рабочых рыбгасаў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на стварэньне пры гаспадарках уласнай харчовай базы.

Белрыбтрэст павінен забясьпечыць гібкае апэрацыйнае кіраўніцтва прудзкімі гаспадаркамі, вядзець усе дробязі іх жыцьця. **Яго непасрэдны абавязак—ліквідаваць бяспрытульнасьць рыбгасаў.**

Побач з вырашчваньнем таварнага карпа трэба зьвярнуць увагу на разьвядзеньне іншых каштоўных парод рыбы—фарэлі, ліна, і інш.

Баявая задача: шляхам рашучай барацьбы з бескгаспадарчасьцю забясьпечыць выхад таварнай прадукцыі карпа ў 1933 годзе ня менш 4000 цэнт.

Валмянскі рыбгас першым у БССР арганізаваў вялікую фэрму па **гадоўлі качак.** Яго прыкладу павінны пасьледаваць усе гаспадаркі. Стада птушак—качак і гусей павінна быць даведзена да 50 тыс. шт. Белрыбтрэст павінен зразумець усю карысьнасьць гэтай справы і больш не ігнараваць яе.

Што трэба зрабіць, каб палепшыць работу на лове? Райкомы і парт'ячэйкі павінны ўзмацніць увагу да работы рыбацкіх брыгад і арцеляў, мабілізаваць іх на барацьбу за максымальны ўлоў рыбы.

Неабходна праверыць склад старшынь арцеляў, умацаваўшы іх лепшымі кадрамі, ачысьціць арцелі ад кулацкіх і рвацкіх элемэнтаў. Трэба правесьці дыферэнцыраваную аплату працы ўнутры брыгад, ліквідаваць абязьлічку ў ацэнцы і снабжэньні рыбакоў.

Праўленьні калгасаў павінны адмовіцца ад поглядаў на рыбалтва, як на пабочную, чужую справу, як на адходны промысел.

Калі 30 проц. усіх вадаёмаў БССР экспляатуюць сыстэмай снабжэньня, то апошняя, неадвазьлічнае. Арцелі і брыгады фармальна прымацаваны да ЗРК, але апошняя ніякага ўплыву на ход лову не аказваюць, яны ня зьвязаны з арцелямі. Усе сутычкі ажыцьцяўляцца праз інструктара рыбных вучасткі, БКС.

ЗРК і фабрычна-заводзкія арганізацыі недаацэньваюць значэньня рыбнага лову—гэтай важнейшай крыніцы рабочага снабжэньня.

Возьмем рыбацкую арцель Бабруйскага вучастку, прымацаваную ЗРК заводу імя Варашылава. Што зробілі заводзкія арганізацыі, каб дапамагчы па палепшэньні лову? Амаль нічога.

Галоўная задача—паставіць усе пашы рыбныя багацьці на службу рабочаму снабжэньню.

Усебеларуская нарада старшынь ЗРК і ЦРК

Прэзыдыум праўленьня Белкаапсаюзу скліча 15-га ліпеня Усебеларускую нараду старшынь ЦРК і ЗРК. На нарадзе будуць абазораны пытаньні аб сталоўнічы разгорнуцьня тавараабароту і бліжэйшых задачах, аб ходзе шкодагародніцкай кампаніі і самазагатоўках.

Нарада заслухае таксама справаздачы двух ЦРК і ЗРК аб становішчы рабочага снабжэньня і мерапрыемствах па барацьбе з растратамі і раскрадваньнем казённай маемасьці.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Рэвалюцыйны Ваенны Савет Саюзу ССР з глыбокім жалем паведамляе аб начаканай сьмерці другога ліпеня г. г. памочніка камандуючага войскамі Украінскай ваеннай акругі, б. начальніка палявога штабу Рэвваенсавету рэспублікі, начальніка штабу Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі і члена Рэвваенсавету рэспублікі

ПАЎЛА ПАЎЛАВІЧА ЛЕБЕДЗЕВА.

Загад Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету ССР Рэспублік

№ 111 3-га ліпеня 1933 г. гор. Масква

Другога ліпеня г. г. памёр памочнік камандуючага войскамі украінскай ваеннай акругі тав. ЛЕБЕДЗЕЎ ПАВЕЛ ПАЎЛАВІЧ, б. начальнік палявога штабу Рэвалюцыйнага Ваеннага Савету Рэспублікі і Начальнік Штабу Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

У памяць зсабліва выдатных заслуг Паула Паўлавіча Лебедзева перад Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміяй Рэвалюцыйны Ваенны Савет Саюзу ССР загадвае:

1. Прысвоіць імя тав. Лебедзева П. П. Кіеўскай артыперыйскай школе;
2. Школу іменаваць: «Кіеўская арты перыйская школа імя тав. Лебедзева».

Народны камісар па ваенных і марскіх справах і старшыня РВС Саюзу ССР—ВАРАШЫЛАЎ.

(БЕЛТА).

Пажыцьцёвая пэнсія сям'і памершага тав. Лебедзева

МАСКВА, 3. (БЕЛТА). Сафнарком СССР назначыў сям'і памёршага тав. П. П. Лебедзева (жонцы — Ользе Нікалаеўне Лебедзевай і непаўналетняй дочцы — Марыі Паўлаўне Лебедзевай) пэрсанальную пэнсію ў памеры 500 руб. у месяц.

За жонкай тав. Лебедзева пажыцьцёва замацавана кватэра П. П. Лебедзева ў гор. Харкаве.

Пахаваньне П. П. Лебедзева СНК пастанавіў прыняць на кошт дзяржавы.

Рузвэльт у другі раз адмаўляецца ад стабілізацыі валют

ЛЁНДАН, 3. (БЕЛТА). Дэлегацыя ПАЗШ апублікавала сёньня другачаканую заяву РУЗВЭЛЬТА па пытаньні аб валютнай палітыцы. У заяве Рузвэльта гаворыцца: «Я лічыў бы катастрофай, калі-б вялікая канфэрэнцыя дзяржаў, скліканая з мэтаю дабіцца больш рэальнай і працяжнай фінансавай устойлівасьці і пазьнішэйшае дабрабыту мас ва ўсіх краінах, дапусьціла-б каб яе ўсага была адцягнута прапановаю аб чыста фінансавым і часовым экспэрымэнце, які датычыцца валюты толькі некалькіх краін. Сьвет ня будзе суцэнкоен на доўгі тэрмін прыстойным абменам у выглядзе часовай і, напэўна, штучнай устойлівасьці валют некалькіх буйных дзяржаў у адносінах іншых валют. Унутраная эканамічная сыстэма краіны стансіць сабою больш буйны фактар яе дабрабыту, чым цана яе валюты пры абмене на валюты іншых дзяржаў. Вось чаму скарачэньне дзяржаўных расходаў, адпаведны ўзровень дзяржаўных паступленьняў і здольнасьць пагашаць урадавыя даўгавыя абавязацельствы маюць такое буйнае значэньне для устойлівасьці, як канечнага этапу. Больш шырокая наша задача заключаецца ў працяжной стабілізацыі валют усіх краін. Золата, або золата разам з серабром можа быць захавана ў якасьці мэтаневага забесьпячэньня валют. Але зараз ня час распыляць золатыя запасы.

Калі сьвет выпрацуе ўзгодненую палітыку, на аснове якой большасьць краін будзе мець ўраўнаважаныя бюджэты і будзе жыць у межах сваіх сродкаў, тады мы зможам з поўнаю падставою абмяркоўваць пытаньне аб лепшым размеркаваньні сусьветных запасаў золата і серабра ў мэтах забесьпячэньня разьвітай базы паасобных валют».

„Залаты блёк" рашыў не паддацца нак'ску ПАЗШ

ЛЁНДАН, 3. (БЕЛТА). У сувязі з заявай Рузвэльта ў колах канфэрэнцыі панує моцнае замяшаньне. Сёньня ўвечары прадстаўнікі «Залатога блёку» прынялі тэкст дэклярацыі, у якой заяўляецца аб цьвёрдай рашучасьці краін, захаваўшых залаты стандарт, за бясьпечыць і ў далейшым вольнае дзеяньне залатога стандарту ў гэтых краінах у адпаведнасьці з залатым аўтарытэтам і існуючымі валютнымі законамі. У дэклярацыі зьмяшчаецца зварот да цэнтральных банкаў з просьбай падтрымліваць цесны кантакт з мэтаю прыдаць максымальную дзейсьнасьць гэтай дэклярацыі. Дэклярацыя падпісана прадстаўнікамі БЭЛЬГІІ, ФРАНЦЫІ, ГАЛЯНДЫІ, ІТАЛІІ, ПОЛЬШЧЫ, І ШВЭЙЦАРЫІ.

Пазыцыю ангельскай дэлегацыі агенцтва «Рэйтэр» выказвае так: «Англія ня зробіць ніякіх крокаў, якія супярэчылі-б інтарэсам дамініёнаў ці магчі-б быць растлумачаны, як варожае выступленьне супроць ПАЗШ, сььядома стаўшых на шлях інфляцыі з мэтаю справіцца са сваім унутраным становішчам».

* * *

ЛЁНДАН, 3. (БЕЛТА). На 4-е ліпеня прызначан сход бюро канфэрэнцыі для абмеркаваньня пытаньня аб адтэрмінаваньні канфэрэнцыі на неакрэсьлены час.

Трэцяе пасяджэньне канфэрэнцыі аб продажы КУЧ

ТОКІЁ, 3 (Белта). 3-га ліпеня пачалося 3-е пленарнае пасяджэньне канфэрэнцыі па продажы КУЧ. Старшынствуе кіраўнік манчжурскай дэлегацыі ЛІН ШЫ-ЮАНЬ. Тав. ЮРЭНЭЎ агласіў «мэмарандум аб асноўных прынцыпах выкупу КУЧ Манчжоу-Го». Пасьля гэтага быў агалошан мэмарандум манчжурскага ўраду, да якога далучана тлумачальная запіска. Пасяджэньне працягваецца.

„Важная падзея ў справе ўмацаваньня міру"

Францускі друк аб пакце васьмі

ПАРЫЖ, 3 (Белта). «Матэн» называе канвэнцыю 8-мі дзяржаў «аб азначэньні агрэсара важнаю падзеяю ў справе ўмацаваньня міру ва Ўсходняй Эўропе».

«Оці журналь» падкрэсьлівае станоўчую ролю, якую адыграў у гэтым пытаньні тав. Літвінаў. Рад газэт называе канвэнцыю свайго роду пактам аб ненападзе краін Усходняй Эўропы і СССР.

«Юманітэ» піша аб вялікім дыпляматычным посьпеху СССР. Пасьля згоды аб зьняцьці ангельскага эмбарго на савецкія тавары, піша газэта, падпісаная ў Лёндане канвэнцыя служыць новым доказам таго, што «капіталістычныя краіны вымушаны прызнаць магутнасьць СССР, лічыцца з мірнай сілай, якую ён прадстаўляе».

Водгукі замежнага друку на скасаваньне эмбарго

ЛЁНДАН, 3 (Белта). Усьведамленьне таго, што ліквідацыя эмбарго зьвязаецца яўным паражэньнем палітыкі цьвёрдалобых, адлюстроўваецца між іншым у тым, што рад кансэрватыўных газэт «Дэйлі мэйль», «Дэйлі экспрэс» і інш. друкуюць паведамленьне аб высылцы асуджаных па працэсу «Мэтра-Вікерс» без камэнтараў.

Цьвёрдалобая «Морнінг пост» па свайму звычаю заяўляе, што пэйкая дагавору не патрэбна, бо «гандаль з Савецкім Саюзам на жаль можа працягвацца і бяз гэтага».

«Дэйлі Геральд» піша, што скончылася «самая недарочная з усіх гандлёвых войн».

«Манчэстар Гардыян» рэзка заяўляе, што «закагчваецца адзін з самых ганебных эпізодаў у дзейнасьці сучаснага ўраду». Эмбарго, паводле слоў газэты, яўна не дасягло сваёй мэты, і ангельскаму гандлю нанесена сур'ёзная шкода.

* * *

Каўкас, 3 (Белта). У літоўскіх палітычных колах адзначаюць скасаваньне ангельскім урадам эмбарго на савецкія тавары як вялікае дасягненьне савецкай дыпляматыі. Афіцыёз «Летувос Айдас» зьмяшчае паведамленьне аб скасаваньні эмбарго пад загалоўкам: «Поўны посьпех палітыкі СССР ў Лёндане».

* * *

ТОКІЁ, 3. (Белта). Большасьць газэт публікуе паведамленьне аб скасаваньні эмбарго на ўвоз савецкіх тавараў у Англію без камэнтараў.

У фашысцкіх канцлягерах

Сіла клясавай салідарнасьці зломіць фашысцкую дыктатуру

ПАРЫЖ, 3. (Уласн. інфарм. «Зьвязды»).

«ЮМАНІТЭ» публікуе вытрымкі з атрыманага МОПР'ам пісьма з канцэнтрацыйнага лягеру ў ГЕЙБЭРГУ (Вюртэмбэрг) аб існуючым там нявыносным рэжыме.

«Арыштаваныя павінны бесьпярэчліва падпарадкоўвацца наглядальнікам. Пры малейшым супраціўленьні наглядальнікі бяз усякага папярэджаньня пускаюць у ход агнястрэльную зброю. Пры набліжэньні да дротавых загарожаў на адлегласьці бліжэй, чым 2 мэтры, ахова мае права страляць бяз усякага папярэджаньня. Апрача, шмат іншых забаронаў арыштаваным не дазваляецца: купля прадуктаў, табаку і папярос.

Зьняволеным сурова забараняецца адчыняць вокны або стаяць перад зачыненымі вокнамі. Нават ноччу вокны павінны заставацца зачыненымі. Пабачэньні не дазваляюцца.

Харчы невыстарчальныя і дрэнная якасьці. Кожны дзень у камэрах 6-8 арыштаваных ад стомленьня трацяць прытомнасьць. Хворыя не карыстаюцца ніякім доглядам.

Асабліва строга абыходзяцца з рэвалюцыянэрамі, для аховы якіх ёсьць шматлікая варта, узброеная аўтаматычнымі вінтоўкамі. Арыштаваным рэвалюцыянэрам забараняецца гутарыць ня толькі ў камэрах, але нават у двары. Кормяць іх адкідамі. Часта яны атрымліваюць усяго толькі па 2-3 лыжкі супу, або зусім нічога не атрымліваюць».

«Нават многія нацыянал-сацыялісты, —піша далей аўтар,—ня могуць згадзіцца з тым, як з намі абыходзяцца і ў знак пратэсту СКІДВАЮЦЬ СВАЕ КАРЫЧНЕВЫЯ КАШУЛІ І РАЗРЫВАЮЦЬ ІХ. Але тыя, якія так паступаюць, самі становяцца вязьнямі фашызму.

Аднак, мы ўсе ходзім з узьнятымі галовамі. Наш дух барацьбы ня зломлен, бо мы ведаем, што СІЛА КЛЯСАВАЙ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЬЦІ РЫХТУЕ КАНЕЦ ФАШЫСЦКАЙ АВАНТУРЫ».

Надзвычайны суд над рэвалюцыйным рабочым

Абвінавачанаму пагражае кара сьмерцю

ВАРШАВА, 3 (Белта). Перад надзвычайным судом у ЗАМОСЬЦІ (Люблінскае ваяводзтва) адбудзецца працэс ЗАХАРЧУКА, абвінавачанага ў забойстве двух старшых паліцэйскіх. Газэта «Экспрэс ПОРАННЫ, сьцьвярджае, што падсудны і яго таварышы ПЁТРА КЛІНЮК І ЯН СЬЛІВІНСКІ былі актыўнымі работнікамі кампартыі і хаваліся ад прасьледваньняў паліцыі. Калі паліцыя зьявілася на канспіратыўную кватэру, каб іх арыштаваць Захарчук і таварышы нібыта адкрылі страляніну з рэвальвэраў і забілі двух старшых паліцэйскіх. У часе пагоні Клінюк і Сьлівінскі БЫЛІ ПАЛІЦЫЯЙ ЗАБІТЫ, а Захарчук паранен. Цяпер ЗАХАРЧУКУ ПАГРАЖАЕ КАРА СЬМЕРЦЮ.

Выбарачнае абсьледваньне засьмечанасьці палёў

МАСКВА, 4 (Белта) У 15 краёх, вобласьцях Саюзу сіламі мясцовых навукова-дасьледчых устаноў, асьпірантуры і пэдагагічнага пэрсаналу сельскагаспадарчых ВНУ, згодна пастанове НКЗ СССР, пачата выбарачнае абсьледваньне засьмечанасьці палёў. Выбарачным абсьледваньнем павінна быць ахоплена ня менш трохсот калгасаў, саўгасаў і груп аднаасобных гаспадарак. Масавая анкета аб пашырэньні пустазельля будзе раздаўцена, апрача таго, па ўсіх раёнах Саюзу. Гэтая кампанія пройдзе пад лёзунгам «кожнаму полю—пустазельны пашпарт».

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Пісьменьнікі БССР і Мардоўскай АССР на прыеме ў стар. СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДА.

Спатканьне мардоўскіх савецкіх пісьменьнікаў з пісьменьнікамі БССР

3-га ліпеня адбыўся вечар сустрэчы дэлегацыі савецкіх пісьменьнікаў Мардовіі з беларускімі пісьменьнікамі. Вечар адкрыў адказны сакратар Арпкамітэту ОСПБ М. Лынькоў.

— Гэты вечар, — падкрэсьліў тав. Лынькоў, — зьяўляецца яшчэ адным доказам інтэрнацыянальнага адзінства атрадаў савецкай літаратуры Саюзу ССР. Але ў сваёй практычнай рабоце мы яшчэ недавоўні зьвязаны з пісьменьнікамі прынечаных раней нацый, мы яшчэ мала ведаем пра гіганцкае сацыялістычнае будаўніцтва на акраінах былой расійскай імпэрыі. Наша задача — сыстэматычна дзяліцца вопытам барацьбы за мастацтва сацыялістычнага рэалізму, дапамагаць адзін аднаму ў змаганьні за пабудову бясклясавага грамадзтва.

У прэзыдыум вечару, апроч гасьцей — Н. Іркаева, Ал. Лук'янава і С. Лявонцева, былі абраны пад шумныя воплескі прысутных народны паэт рэспублікі Янка Купала, народны артыст Уп. Галубок, акад. Домбаль, старшыня праўленьня ДВБ Браўковіч, пісьменьнікі — Чорны, Галавач, Лынькоў, Шапавалаў, Гурскі.

Мардоўскі пісьменьнік тав. Іркаеў у кароткіх рысах азнаёміў аўдыторыю з дасягненьнямі эканомікі і культуры Мардоўскай Аўтаномнай вобласьці, атрыманымі ў выніку няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, на аснове правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

— Адна з самых адсталых правінцый царскай Расіі, запалоненая магістрамі, дзе родная мова карэннага працоўнага насельніцтва абазначалася ганебнай і дзе да Кастрычніка на ёй выдавалася толькі евангельле, на сёньняшні дзень мае свае нацыянальныя школы, выдавецтва, якім выпушчана сёлета ў сьвет звыш 30 назваў арыгінальных кніг, мае сваіх выдатных пісьменьнікаў (Яндол, Лук'янаў, Моро), тэатральную студыю і г. д., і г. д.

Дакладчык асобна спыніўся на надзвычайнай ветлівым прыёме і ўважлівых адносінах да дэлегацыі мардоўскіх пісьменьнікаў у Менску, дзякуючы чаму за тры дні пробываньня тут яны здолелі добра азнаёміцца з буйнейшымі дасягненьнямі сацыялістычнага будаўніцтва сталіцы БССР.

Пасьля прамовы тав. Н. Іркаева мардоўскія і беларускія паэты і пісьменьнікі — т. т. Лук'янаў, Іркаеў, Броўка, Дарожны, Шапавалаў, — выступілі з чытаньнем сваіх твораў. В. Казлоўскі і С. Нортман прачыталі рэчы мардоўскіх таварышоў у перакладзе на беларускую мову.

Вечар таварыскай сустрэчы прайшоў пад знакам далейшага цеснага, дэлегацкага супрацоўніцтва абодвух нацыянальных савецкіх літаратур у іх агульнай барацьбе за сацыялізм. Л.

Напярэдадні ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў

Сельска - гаспадарчая станцыя ЦК ЛКСМБ разгарнула шырокую падрыхтоўчую работу ДА ДРУГОГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ.

У бліжэйшыя дні станцыя выпускае з друку спэцыяльную брашуру, прысьвечаную зьезду пад назвай «У ДАПАМОГУ ДАЗОРАМ ЗА ВЯЛІКІ ЎРАДЖАЙ».

Брашура зьявіцца праграмай і дапаможнікам у штодзённай барацьбе калгасных дазорных камсамольскіх груп за высокі ўраджай.

Сельгас. станцыя да зьезду выпусьціць таксама брашуру тав. ГАРБУНОВА «БАРАЦЬБА СА СТРАТАМІ ПРЫ ЎБОРЦЫ ГАРОДНІНЫ».

У бліжэйшыя дні выйдуць з друку два плякаты, прысьвечаныя зьезду калгасьнікаў, аўтарам якіх зьяўляецца сельгас-станцыя ЦК ЛКСМБ. Першы плякат — «КАМСАМОЛ — ШЭФ КАНЯ», другі — «КАМСАМОЛ — ВАРТАВЫ КАЛГАСНАЙ МАЕМАСЬЦІ».

ДА ЗЬЕЗДУ ПРЫЎРОЧВАЕЦЦА АДЧЫНЕНЬНЕ КАНСУЛЬТАЦЫІ ПА ПЫТАНЬНЯХ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ. Да работы ў ёй прыцягваюцца лепшыя сілы навукова-дасьледчых інстытутаў і сельска-гаспадарчых устаноў Менску.

Аргмасавы сэктар Наркамзему БССР рыхтуе да зьезду калгасьнікаў-ударнікаў вялікую ВЫСТАЎКУ СЕЛЬСКАГАСПАДАРКІ І АГРАТЭХНІКІ.

На справе ўмацоўваем інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных мас

З пастановы агульнага сходу работнікаў маскоўскага тэатру Ленсавету

Заслухаўшы інфармацыю дырэктара тэатру т. Аболіна аб выніках работы тэатру ў гор. Менску, калектыў адзначае, што працоўныя Менску аднесьліся да нашых спэктакляў з выключнай увагай і гэта яшчэ раз даказала не на словах, а на справе брацкае адзінства народаў Савецкага Саюзу ў барацьбе за інтэрнацыянальнае выхаваньне.

За час гастроляў тэатрам абслужана 25.000 арганізаваных гледачоў, праведзена сярод працоўных мас растлумачальная работа на спэктаклях.

Заканчваючы сваю работу ў г. Менску, дырэкцыя і калектыў Маскоўскага тэатру Ленсавету выказваюць сваю падзяку партыйным, савецкім, прафсаюзным і грамадзкім арганізацыям, а таксама мясцоваму друку за чулыя і ўважлівыя адносіны да тэатру.

Ад імя агульнага сходу: Дырэктар АБОЛІН.
За сакратара ячэйкі КП(б)Б ЛОГІНАЎ.
Старшыня мясцкому ШЭРАМЕТНЕЎ

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. Альфэрчыка Сямёна Цімафеевіча, члена партыі, партбілет № 2494153 зьявіцца ў ПК ЦКК КП(б)Б, або паведаміць свой адрас, месца жыхарства і работы (Менск Савецкая, 55, 3 паверх, 18 пакой).

Просьба да ўсіх парторганізацый, ведаючых месца знаходжаньня памянёнага таварыша, паведаміць ПК ЦКК КП(б)Б.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б СУХАЧАВА.

Аддзел кадраў ГК КП(б)Б выклікае членаў КП(б)Б тав. Госьцёва М., Арсеньцева і Кажэўнікава не пазьней 5-га ліпеня, пакой № 55.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Сьпіс таварышоў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для правядзеньня падрыхтоўчай работы на прадпрыемствах да другога ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў і раёнтара зьлетту.

Усе таварышы павінны зьявіцца сёньня-ж а 5-ай гадз. увечары на нараду ў дом Камасьветы (малая заля), уваход з вул. Энгельса.

Гнядзько — завод імя Варашылава. Зэйфман — «Камунар», Чачупін — «Бальшавік», Паўловіч—зав. імя Молатава, Вішнінская—фабрыка «Кастрычнік», Асаўляк—зав. «Ударнік», Байка чоў—зав. імя Мясьнікова, Нэйштадт — фабрыка «Усход», Салдаценка—абутковая фабрыка, Левіна—ф-ка «Камунарка», Зяньковіч—хлебазавод, Капляневіч —друкарня імя Сталіна, Додзін—ф-ка імя Крупскай, Герчыкаў—Эльвод, Эльпэрын—ф-ка імя Тэльмана, Мінц—дэпо вагонная, Сучкова—шчотачная фабрыка, Сьмірноў (Малпрамтрэст) — мя сакамбінат, Іоззф—кушнерная фабрыка, Адзінец — «8 сакавіка», Мазур (СНК) — завод «Беларусь», Фрыд (радыёвытв.)—хэмфармазавод, Салдаценка (ЦК)—«Чырвоны хэмік», Эйдлін — завод «Пралетары», Сідзіна—сьпіртзавод, Вольпава (НКФ) — «Чырвоны золак», Кабакоў—фабрыка імя Фрунзэ, Бураковў (база Сельгасснабу) — «Чырвоны тэкстыльшчык», Капусьцін — шпалерная ф-ка, Фралоў («Зьвязда»)—лямпавая фабрыка, Мяжуеў — абутковая майст., Войцан—групком харчавікоў, Улэзаў—УЭА, Розэнгаўз—БСКА, Дамэсін (газэта «Акцыбр»)—ФЗВ «КІМ», Стырна—МТМ, Плотнін—арцель «Чырвоны абутнік», Дубэрштэйн (Белгандаль)—гута, Гайдук (ДВБ)—Мантэкстыльпрамсаюз, Шыпко—малочны завод, Блюмкін—аўтарэмнаб, Карначоў —дэпо вагонная, Мыпгалаў—служба шляху, Фрыдлянд—служба эксплёатацыі, Файнцрвіч—трампарк, Журомскі —Саюзтранс, Нікалаеў (саюз працасьвяты)—Белдзяржбуд, Файнгаўз—Менбуд, Крабінскі (ЦСПСБ) — Вадаканалтрэст, Шнілэр—Дом Ураду, Эфрос — Энэргабуд, Тарасаў—групком будаўнікоў, Даніловіч — завод стандартных дамоў, Кульбак (Наркамлёгпрам)—завод малочных кіслот, Клябанаў—шпацінная ф-ка, Елянеўскі—завод ланцугоў Галля, Хэйфэц (Загатабожна)—арт. «Чырвоны мэталіст», Рубенчык — прамбытсаюз, Мархашоў—цагельня № 1, Шыповіч—цагельня № 1-3, Бепьскі—цагельня 2-4, Шчадзістаў («Зьвязда»)—цагельня № 3, Гольдшварц («Зьвязда»)—цагельня 5-6.

Павінны таксама зьявіцца т. т. Вайновіч (Загатлён), Стрэле (Наркамзем), Ваксман (Белкаапсаюз), Бравэрман («Рабочий»).

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 г. дня. Вялікі замежны мастацкі фільм ЖЫЦЬЦЁ за ЖЫЦЬЦЕ

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ Ракавыя прыкметы

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯБАЛЯТЫ (кіно фільм у 3-х сэрыях

ПРАЛЕТАРЫ Малпавы тэатр камедыя ў 7 частках

КІНО СПАРТАК З 6-га ліпеня МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

І ЛЁД РАСТАЕ"

у 6 частках.
ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ.
КАСА—з 3 гадз. 30 м.

БЕЛДЗЯРЖКІНО

АБВЯШЧАЕ НАБОР у Маскоўскі Дзяржаўны Інстытут Кінематографіі на рэжысэрскі і сцэнарны факультэты і Ленінградзкі Інстытут кіно-інжынэраў на факультэты: механічны, эксплёатацыйны і фота-хэмічны.

У інстытуты прымаюцца асобы ва ўзросьце ад 18 да 35 год.

Заявы падаваць у трэст Белдзяржкіно да 25-га ліпеня з паказаньнем хатняга адрасу і месца працы.

Да заявы прыкладаюцца наступныя дакументы:

1) арыгінальны дакумэнтаў аб адукацыі; 2) справка аб стане здароўя; 3) аб сацыяльным становішчы; 4) сацпаходжаньне; 5) 2 фота-карткі, а на сцэнарны факультэт абавязкова прадстаўленьне сваіх творчых работ і кампэтэнтных водзываў аб іх.

Праходжаньне сацыяльных іспытаў абавязкова—у Дзяржаўным інстытуце кінематографіі з 15 жніўня па 1-е верасьня, і ў Ленінградзкім Інстытуце кіно-інжынэраў з 1-га па 15-е жніўня.

Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.

Заявы з дакумэнтамі накіроўваюцца заказным лістом на адрасу: г. Менск, Савецкая 90, Белдзяржкіно.

Дадатковыя даведкі па пытаньнях набору можна атрымаць у трэсьце БДКіно і ў аддзяленьнях—Менскім, Віцебскім, Аршанскім, Бабруйскім, Гомельскім і на кінафабрыцы „Савецкая Беларусь" у г. Ленінградзе.

БАРЫСАЎСКІ РАСІЙСКІ ПЭДТЭХНІКУМ

абвяшчае АСЕНЬНІ ПРЫЁМ НА 1 КУРС ТЭХНІКУМУ.

Прымаюцца асобы скончыўшыя семігодку, згодна правіл прыёму ў тэхнікумы.

Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам, сталоўкай і стыпэндыяй на 75 проц.

Заявы і дакумэнты прымаюцца да 1-га верасьня г. г.

Дырэкцыя.

ЛУЖАСЬНЯНСКІ ІЛЬНАКАНАПЛЯВОДНЫ ТЭХНІКУМ

абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР на 1-шы курс тэхнікуму.

Іспыты з 25-га жніўня па 1 верасьня.
Пачатак заняткаў з 1-га верасьня.
Усе паступаючыя трымаюць іспыты ў аб'ёме 7 груп па прадметах: мове, грамадазнаўстве, матэматыцы, фізыцы і хэміі.
Да заявы дадаюцца дакумэнты ў арыгіналах: аб адукацыі, сац. становішчы, здароўі, анкета, 2 фота-карткі і паштовых марак на 40 кап.
Стыпэндыя па пасьпяховасьці.
Інтэрнатам забясьпечваюцца ўсе.
Пры тэхнікуме ёсьць сталоўка.
Адрас: гор. Віцебск, Лужасьнянскі с.-г. тэхнікум.

Дырэкцыя.

БЕЛАРУСКІ ВУЧЭБНЫ КАМБІНАТ СУВЯЗІ

АБВЯШЧАЕ

асеньні набор студэнтаў

на 1-шы курс дзённага тэхнікуму сувязі, з адрывам ад вытворчасьці на аддз.: тэлефоннае, тэлеграфнае, радыё і эканамічнае.

На 1-ы і II-гі курс вячэрняга тэхнікуму, без адрыву ад вытворчасьці.

У школу ФЗВ сувязі на аддзяленьні: тэлеграфнае, тэлефоннае, радыё і фінансавае.

Адначасова працягваецца прыём на 1 з пал. гадовы тэхнікум сувязі.

Тэхнікум сувязі рыхтуе: тэхнікаў 1-га разраду па адпаведнай спэцыяльнасьці, а школа ФЗВ сувязі—кваліфікаваных мантэраў па тэлеграфіі, тэлефаніі і радыё, памбухгалтароў і рахункаводаў.

У тэхнікум і школу ФЗВ прымаюцца: рабочыя, іх дзеці, сувязісты і іх дзеці, калгасьнікі, іх дзеці і інш., узростам ад 16 год з адукацыяй 7-мігодкі.

УВАГА: на II-гі курс вячэрняга тэхнікуму прымаюцца асобы на базе 8—9 годкі.

У 1 з пал. гадовы тэхнікум прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 7-мігодкі і маючыя стаж па сувязі на менш 2-х год.

Пры паступленьні адбудуцца іспыты: па матэматыцы, фізыцы, белкове, расійскай мове і грамадазнаўстве.

Аб тэрміне зьлітку будзе паслана асабістае паведамленьне кожнаму залічанаму.

Дакумэнты ў арыгіналах прадстаўляць наступныя:

1) анкету, засьведчаную партыйнымі або савецкімі арганізацыямі; 2) даведку аб адукацыі; 3) даведку аб здароўі; 4) даведку аб узросьце; 5) даведку аб матар'яльным і сацыяльным становішчы бацькоў; 6) дзьве фотакарткі; 7) аб вайсковай павінасьці.

Залічаныя студэнты і вучні ФЗВ, пры бываючыя з раёнаў забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй. Ёсьць таксама сталоўка.

Прыём заяў з 20-VI па 1-VIII—1933 г.

Заявы накіроўваць разам з дакумэнтамі на адрасе: гор. Менск, Камароўка, Лясная вул. дом № 28.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ТОРГСІН

АБВЯШЧАЕ, ШТО Ў МЭТАХ ВЫГАДЫ ТРЫМАЛЬНІКАЎ ТАВАРНЫХ КНІЖАК ва ўсіх аддзяленьнях і магазынах ВІО Торгсін'у прымаюцца ад трымальнікаў даручэньні на пераводы тавараў кніжак у іншыя гарады.

Пераводы прымаюцца аддзяленьнямі і магазынамі ВІО ТОРГСІН і праводзяцца праз банк у наступных выпадках:

а) пераменa месца жыхарства, або часовы выезд у іншы горад, выклад бліжэйх сваякоў, якія жывуць у іншым горадзе і необходнасьць дапамогі ім.

б) пераводы членам сем'яў і всім, якія адпраўляюцца ў адпачынак на курорты і ў санаторыі.

в) пераводы частні сум, паступіўшых ад прадпрыемстваў і асобаў.

За пераводы сум у паказаных вышэй выпадках бярэцца камісія ў 3% латым вылічэньні, якая ўтрымліваецца з астачы тавараў кніжкі пры правядзеньні перазоду.

Бел. к-ра ВІО ТОРГСІН.

На падставе распараджэньня камітэту па загатоўках пры СНК СССР ад 2-IV-33 г.

Белкантора „Заготконь"

зьяўляецца адзінай манапольнай сыстэмай па загатоўцы і збыту гаспадарча-ня прыгодных коняй. А таму даводзіцца да ведамах усіх ОРС, ЗРК, і інш. арганізацый БССР, якія жадаюць атрымаць гаспадарча-ня прыгодных коняй, што яны павінны ЗАКЛЮЧЫЦЬ УМОВЫ з Белканторай „Заготконь" або з яго конбазамі, якія знаходзяцца ў гар. Менску, Магілеве, Гомелі і Слуцку.

БЕЛЗАГАТКОНЬ.

Інстытут савецкага будаўніцтва і права Бел. Акадэміі Навук

абвяшчае НАБОР асьпірантаў

Тэрмін падрыхтоўкі—2 з палавой гады.

Падрыхтоўка будзе па наступных профілях:

1) савецкае будаўніцтва;
2) гаспадарчае права;
3) земельна-калгаснае права;
4) крымінальнае права.

Пра умовы прыёму заяў глядзі газэту „ЗЬВЯЗДА" ад 11 красавіка г. г.

Падаваць заявы на адрасу: г. Менск, пр. Леніна 1 і Ўніверсытэцкай, Беларускай Акадэміі Навук, Інстытут асьпірантуры.

Дырэкцыя.

ПРАКОПАЎСКІ ПТУШКА-ТРУСАГАДОЎЧЫ ТЭХНІКУМ

абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў на І-я і II-я курсы птушкаводнага і трусаводнага аддзяленьняў і вячэрняга аддзяленьні на 1-ы курс.

Тэхнікум рыхтуе зоатэхнікаў па птушкаводзтву і трусаводзтву для сыстэмы Наркамсаўгасаў.

Студэнты забясьпечваюцца сталоўкай, інтэрнатам і стыпэндыяй на пасьпяховасьці.

Тэрмін навучаньня 3 гады.

На 1-ы курс прымаюцца асобы з адукацыяй 7-годкі, на 2-я курсы—з адукацыяй 8-мі груп.

Умовы прыёму на вячэрняга аддзяленьні тыя-ж што і на дзённым.

Заявы з дакумэнтамі прымаюцца да 20-га жніўня.

Іспыты з 25-га жніўня па 1-га верасьня.

Пачатак заняткаў з 1-га верасьня 1933 г.

Адрас: пошт. аддз. Церахоўка. Праваноўскі птушка-трусагадоўчы тэхнікум.

Дырэкцыя.

Упаўнаважанаму цэнтральнай дзяржкамісіі па вымяначэньню ўраджайнасьці і памеру валавога збору збожжавых культур па БССР

патрэбны:

эканаміст па сельскай гаспадарцы.

машыністка-стэнаграфістка.

Аплата па згодзе. Забясьпечэньне 1 сп. 1 кат.

Адрас: Савецкая 57, тэл. 20-807.

КУПЛЯЙЦЕ ТАВАРЫ ПА ЗЬНІЖАНЫХ ЦАНАХ!

Ва ўсіх магазынах Менскай базы БЕЛГАНДЛЮ

праводзіцца ПРОДАЖ разных тавараў са СКІДКАЙ да 60 проц.

У ПРОДАЖЫ НАСТУПНЫЯ ТАВАРЫ:

1. Гатовая вопратка.
2. Трыкатаж.
3. Розны ўцільны абутак.
4. Трыко (мануфактура).
5. Мехавыя тавары.
6. Бурні фэтравыя.
7. Галаўныя ўборы мужчынскія і дзіцячыя.
8. Жаночыя шляпы і бераты.
9. Галантарэя і рэмні.
10. Скульптура.
11. Цацкі.
12. Мэбля.
13. Шорныя вырабы.
14. Шчоткі.

МЕНБАЗА БЕЛГАНДЛЮ.

МЕНСКІ ФІЛІЯЛ ЛЕНІНГРАДЗКАГА аўтадарожнага рабфаку

абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў на ўсе курсы дзённага і вячэрняга рабфаку.

Рабфак рыхтуе кадры для Ленінградзкага аўтадарожнага інстытуту.

Заявы прымаюцца з 25-га ліпеня па 20-га жніўня.

З 25-га жніўня пачынаюцца іспыты.

Паступаючыя павінны прадставіць наступныя дакумэнты: засьведчаную анкету, камандыроўку, даведку аб сак. паходжаньні, даведку аб месцы працы, рабочым стажы, пасьведчаньне аб асьвеце, даведку аб узросьце, аб стане здароўя, дзьве фотакарткі.

Заняткі пачнуцца 1-га верасьня.

Дырэкцыя.

Адкрыт прыём заяў у Мсьціслаўскі пэдагагічны тэхнікум і на аднагадовыя пэдкурсы.

Прымаюцца з адукацыяй ня ніжэй сямігодкі. Прынятыя забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.

Заявы прымаюцца да 1-га верасьня. Да заявы прыкладаюцца дакумэнты, згодна існуючых правіл для паступленьня ў навучальныя установы.

Адрас: Мсьціслаў, пэдтэхнікум.

Дырэкцыя.

МЕНСКІ плянава-эканамічны тэхнікум

абвяшчае НАБОР студэнтаў на аддзяленьні:

Народна-гаспадарчага вучоту з адрывам ад вытворчасьці і без адрыву ад вытворчасьці на 1-шы курс.

Плянавае:—без адрыву ад вытворчасьці на 1-шы курс і з адрывам ад вытворчасьці на 2-гі курс.

Тэхнікум рыхтуе эканамістаў-інспэктароў па вучоту прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, канюнктурыстаў, плянавікоў - эканамістаў сярэдняй кваліфікацыі.

Студэн